Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Рукапісы, якія не прымаюцца, назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў)

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. На 3 — 2 р. 70 к. На 6 — 4 р. — к. На 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкарэй пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкарэй наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапкарэй перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльныя ад 50 проц. дарожэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 квадрат — 15 к. За кожны дадатковы — 15 к. Вестрыдуці і чырвонадарожкі за квадрат — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЦАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ЕЎДАРЕЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 8 (2497 Пятніца 11-га студзеня 1929 г.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР,

якая прынята на юбілейнай (IV) сэсіі VIII скліканьня.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускае ССР, сабраўшыся ў пачаткавы дзень дзесяцігодзьдзя абвешчаньня Ўлады Саветаў на Беларусі, ад імя рабочых і сялян шлае сваё пламеннае прывітаньне штабу бальшавізму на Беларусі—Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Незалежнасьць і вольнае нацыянальнае разьвіцьцё Савецкай Беларусі, самы факт утварэньня Беларускае ССР неразрыўна зьвязаны з работай і барацьбой бальшавіцкай партыі. Роўна дзесяць год таму назад на сваім першым з'езьдзе Камуністычная Партыя Беларусі сказала першыя за імя словы аб вольнай, незалежнай Савецкай Сацыялістычнай Беларусі. Ад тэй пары праз усе іспыты вайны, акупацыі, белабандыцкіх налётаў і паўстаньняў Камуністычная Партыя Беларусі стаяла і стаіць на чале абароны маладой Рэспублікі, на чале сацыялістычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў нашай зруйнаванай, адсталай краіне.

Юбілейная Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, падлічыўшы вынікі гэтай вялікай барацьбы і работы ў культурным і гаспадарчым будаўніцтве за дзесяць год дыктатуры пралетарыяту Беларусі, канстатуе аграмаднае прасоўваньне наперад ва ўсіх бяз выключэньня галінах.

Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту заяўляе, што ўсе гэтыя посьпехі Савецкай Улады на Беларусі сталі магчымымі толькі дзякуючы таму, што наша Камуністычная партыя, зьяўляючыся атрадам магутнай УсеКП(б), ішла па верному ленінскаму шляху, праводзіла сапраўды бальшавіцкую палітыку, сапраўды пралетарскую лінію, ажыцьцяўляла моцны саюз рабочае клясы з селяцтвам—залог канчатковае перамогі дыктатуры пралетарыяту.

У новае дзесяцігодзьдзе мы ўступаем ва ўмовах узросшых цяжкасьцяў, ва ўмовах абвастрэньня клясавае барацьбы, зьяўляючыхся вынікам нашага нячуванага сацыялістычнага ўзросту.

Сэсія заяўляе ЦК КП(б)Б, што рабочых і сялян Беларусі гэтыя цяжкасьці не ўстрашаюць. Не для гэтага былі праліты рэкі рабоча-сялянскай крыві, не для гэтага мы так упарта будавалі гэтыя дзесяць гадоў, каб у сучасны момант адступаць перад цяжкасьцямі.

Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ўпэўнена, што пад сталым і цьвёрдым кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б усе гэтыя цяжкасьці будуць таксама з посьпехам пераможаны, як і тыя, неямерна найбольш сур'ёзныя, якія сталі перад партыяй і намі дзесяць год таму назад.

Нахай жывуць бальш вікі Беларусі!

Нахай жыве Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі—кіраўнік працоўных мас Беларусі ў іх барацьбе за пабудову сацыялізму!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

1 студзеня 1929 г.
г. Менск.

Постановление Центрального Исполнительного Комитета БССР,

принятое на юбилейной (IV) сессии VIII созыва.

Центральный Исполнительный Комитет Белорусской ССР, собравшись в знаменательный день десятилетия объявления Власти Советов в Белоруссии, от имени рабочих и крестьян посылает свой пламенный привет Штабу Большевизма в Белоруссии—Центральному Комитету Коммунистической Партии (большевиков) Белоруссии.

Независимость и свободное национальное развитие Советской Белоруссии, самый факт создания Белорусской ССР неразрывно связаны с работой и борьбой большевистской партии. Ровно десять лет тому назад на своем первом съезде Коммунистическая Партия Белоруссии сказала первые великие слова о свободной, независимой Советской Социалистической Белоруссии. С того времени через все испытания войны, оккупации, белобандитских налетов и восстаний. Коммунистическая Партия Белоруссии стояла и стоит во главе обороны молодой Республики, во главе с социалистического, хозяйственного и культурного строительства нашей разрушенной отсталой страны.

Юбилейная Сессия Центрального Исполнительного Комитета БССР, подведя итоги этой великой борьбы и работы в культурном и хозяйственном строительстве за десять лет диктатуры пролетариата Белоруссии, констатирует огромный прогресс во всех без исключения областях.

Сессия Центрального Исполнительного Комитета заявляет, что все эти успехи Советской Власти в Белоруссии стали возможными только благодаря тому, что наша Коммунистическая Партия, являясь отрядом могучей ВКП(б) шла по верному ленинскому пути, проводила действительно большевистскую политику, действительно пролетарскую линию, осуществляла мощный союз рабочего класса с крестьянством,—залог окончательной победы диктатуры пролетариата.

В новое десятилетие мы вступаем в условиях возросших трудностей, в условиях обострения классовой борьбы, являющихся результатом нашего неслыханного социалистического роста.

Сессия заверяет ЦК КП(б)Б, что рабочих и крестьян Белоруссии эти трудности не устрашают. Не для этого были пролиты реки рабоча-крестьянской крови, не для этого мы так упорно строили эти десять лет, чтобы в настоящий момент отступать перед трудностями.

Сессия Центрального Исполнительного Комитета уверена, что под постоянным и твердым руководством ЦК КП(б)Б все эти трудности будут также с успехом преодолены, как и те неизмеримо более серьезные, которые стояли перед партией и нами десять лет тому назад.

Да здравствуют большевики Белоруссии!

Да здравствует Центральный Комитет Коммунистической Партии (большевиков) Белоруссии — руководитель трудящихся масс Белоруссии в их борьбе за строительство социализма!

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ЧЕРВЯКОВ

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ХАЦКЕВИЧ.

1 января 1929 г.
г. Минск.

Югаславія ў дні самаўладзтва.

СУДЫ ПАСТАЎЛЕНЫ ПАД АПЕКУ ПАЛІЦЫІ.

ВЕНА, 9-1. З Белграду паведамляюць, што агалошана некалькі новых дэкрэтаў караля, якімі поўнасьцю зьнішчаецца незалежнасьць судзьдзяў; устаўляецца, што югаслаўскіх падданых за антыдзяржаўную дзейнасьць заграніцаю будуць пакараны, згодна закону аб абароне дзяржавы; засноўваецца надзвычайны суд для сьпешнага разгляду злачынстваў. Права канфіскацыі газэт, згодна гэтых дэкрэтаў, пераходзіць ад суду да паліцыі.

ПАРТЫЯ РАДЗІЧА РАСПУШЧАНА.—АБУРЭНЬНЕ Ў ХАРВАТЫІ ПРОЦІ ЗДРАДНІЦТВА ПАРТЫЙНЫХ ЛІДЭРАЎ.

ВЕНА. 3 Югаславіі паведамляюць, што водпуг урадавага загаду, распушчана партыя Радзіча. Распушчана таксама харвацкая партыя Франка.

Водпуг атрыманых у Вене апошніх паведамленьняў, радавыя сябры партыі Радзіча абвінавачваюць лідэраў партыі, асабліва Мачэка, у адкрытым здрадніцтве. З прычыны тэрору гэтыя абвінавачаньні не адбіваюцца ў друку. Новыя мерапрыёмствы, якія ўжываецца дыктатура, накіраваны ў першую чаргу проці левага крыла загрэбскае апазіцыі і проці рабочых арганізацый. У апошнія дні паліцыя ўчыніла шмат вобыскаў.

Венская «Рэйхспост» паведамляе, што югаслаўскі ўрад набыў самы буйны харвацкі газэтны канцэрн «Друкарня». Такім парадкам, урад фактычна трымае ў сваіх руках большую частку загрэбскага друку.

ПЕРАВАРОТ ПАДРЫХТАВАНЫ ФРАНЦЫЯЙ І АНГЛІЯЙ.

ВЕНА, 9-1. Добра асьвядомленыя аўстрыйскія газэты мяркуюць, што Англія і Францыя загадзя ведалі аб падрыхтоўцы перавароту ў Югаславіі; самы пераварот адбыўся пры падтрымцы Францыі, Англіі-ж нібыта заняла больш стрыманую пазіцыю.

ХВОРЫ ДЗЯРЖАЎНЫ АРГАНІЗМ.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 8-1. Наконт падзей у Югаславіі газэта «Акшам» піша, што «Югаславія зьяўляецца штучнаю дзяржавай, народжанаю вайною. Кароль хацеў навязаць сэрбскую гегемонію іншым народам, якія адрозьніваюцца адзін ад аднаго як мовай, так і рэлігіяй і культурай. Спроба сэрбаў паўтарыць вопыт асманскіх султанаў у эпоху самавызначэньня нацыянальнасьцяў пацерпіць няўдачу».

УДЗЯЧНАСЬЦЬ ПРАФСАЮЗАМ СССР

МАСКВА, 4-1. Як ужо паведамлялася, УЦСПС і ЦК саюзу транспартнікаў перад лі транспартным рабочым страйку, якія бастуюць ужо 8-мы тыдзень, 15.000 рублёў. Старшыня фінансавага саюзу транспартных рабочых прыслаў на імя ЦК саюзу транспартнікаў СССР ліст, у якім ад імя агульнага сходу гельсінгфорскіх бастуючых рабочых выказвае ўдзячнасьць савецкім транспартнікам за прысланую дапамогу.

Францыя дрыжыць за цэласьць антысаведкага блёку.

Орган Брыяна выступіў з „парадамі" Польшчы, каб яна абумовіла ў пратаколе непарушнасьць яе абавязацельстваў да іншых дзяржаў.

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ АМЭРЫКІ СПАТКАЛА ПРЫХІЛЬНА НОТУ ЛІТВІНАВА.

Загад Францыі да сваіх вассалаў.

ПАРЫЖ, 9 I. „Тан" сёньня прысьвечвае перадавіцу савецкай прапанове да Польшчы, прычым імкнецца пашырыць кола ранейшых заўваг проці савецкага праэкту пратаколу. «Тан» пішуць: «Паколькі прапанова паходзіць з Масквы, якая заўсёды ставіць свае эвалюцыйныя мэты, дык да яе трэба аднесьціся зельмі асьцярожна і згадзіцца на яе, толькі дакладна высьветліўшы сапраўдныя мэты гэтае прапановы і выпляваючыя з яе непасрэдныя і ўкосныя вынікі. Польшча павінна паставіць сабе запытаньне, ці ня іменно гэтая прапанова пастаўкі, ці ня імкнецца яна адкалоць Польшчу ад яе саюзьнікаў і паставіць яе ў нязьмкае становішча перад Лігаю Нацый. Толькі распаўсюджаньне прапановы на паўднёвых і заходніх суседзяў Польшчы зрабіла-б яе пажаданаю, бо тады зьнікла-б магчымасьць узброенага канфлікту між СССР і гэтымі эўрапейскімі дзяржавамі. Праўда, СССР гатоў паўтарыць прапанову балтыцкім дзяржавам, у выпадку падпісаньня імі пакту Келёга, і не супярэчыць проці далучэньня да пратаколу Румыніі. Адак, з боку Польшчы было-б зельмі неасьцярожным падпісаць пратакол бяз Румыніі і Балтыцкіх краёў. Польшча не павінна адказвець Маскве, пакуль ня будзе дасягнута поўная згода з Румыніяй аб тым, каб заўтра на любых умовах міжнародныя абавязацельствы Польшчы, якія выплываюць з угавораў, засталіся агаворанымі ў пратаколе. Можна быць упэўненым, што Варшава і Бухарэст, якім пагражае аднолькавая небясьпека, захаваюць у гэтай справе да канца сваю адзінасьць. Контр-прапанова польскага ўраду дасьць магчымасьць в сьветліць магчымасьці адносна расейскага праэкту. Але трэба спадзявацца, што гэтыя контр-прапановы шчыльна зачыняць дзьверы для ўсялякае нязручнае нечаканасьці і для ўсялякае авантуры».

„Крок ад дыскусіі ў сапраўднасьць".

СПРЫЯЮЧАЯ АЦЭНКА НОТЫ ЛІТВІНАВА Ў АМЭРЫЦЫ.

НЬЮ ЁРК, 9-1. «Іўнінг Тэлеграм» у перадавіцы падрабязна спыняецца на зьмесьце ноты Літвінава да Польшчы з прапановаю надаць правамоцнасьць пакту Келёга. Газэта падкрэсьлівае, што СССР зьяўляецца першаю дзяржавою, якая спрабуе ажыцьцёвіць пакт Келёга на справе.

„Вашынгтон Сарт", абмяркоўваючы ў перадавіцы ноту Літвінава, піша: «Савецкая Расея прапануе абярнуць пакт Келёга з дыскусійнае тэмы ў сапраўднасьць. Проці савецкае прапановы, якая зьяўляецца выключна практычным пачынаньнем, нельга супярэчыць».

„Захоп Бэсарабіі ня можа быць забыты".

НЯМЕЦКАЯ ГАЗЭТА АБ АДНОСІНАХ РУМЫНІІ ДА ПРАПАНОЎ СССР.

БЭРЛІН, 9-1. Орган цяжкае прамысловасьці «Рэйніш Вэстфэлішэ Цэйтунг» выказваецца проці пункту погляду Румыніі аб ноце Літвінава. На думку газэты, в прапановы Літвінава відаць, што Румынія таксама можа далучыцца да прапанаванага ўгавору. «Румынскі ўрад,—піша газэта,—мае ўсе падставы быць недаверлівым. Усе вельмі добра ведаюць, што захоп Бэсарабіі зьяўляецца самаю вялікаю несправядлівасьцю ў адносінах да Расеі, якое Расея ніколі не забудзе і ня можа забыць».

Нарада ў Пілсудзкага аб прапановах СССР.

ВАРШАВА, 9-1. У Бэльвэдэры адбылася з удзелам Пілсудзкага нарада міністра замежных спраў Залескага, нам. міністра замежных спраў Высоцкага і польскага паслыньніка ў СССР Патэка. На нарадзе абмяркоўвалася пытаньне аб адказе на савецкую прапанову.

Пад Пуанкарэ апушчаецца глеба.

ЗА ЎРАД СТАЯЦЬ ТОЛЬКІ ПРАВЫЯ ГРУПОЎКІ. ПАГОНЯ САЦЫЯЛІСТАЎ ЗА ПАРТФЭЛЯМІ Ў БУДУЧЫМ УРАДЗЕ. КАМПАРТЫЯ НА НЯЗЬМЕННАЙ ПЛЯТФОРМЕ—«КЛЯСА ПРОЦІ КЛЯСЫ».

ПАРЫЖ. Намер радыкалаў згуртавана выступіць проці сучаснага складу ўраду, незалежна ад зьместу яго дэкларацыі, ацэньваецца ў палітычных колах, як шансы магчымасьці адкрытага ўрадавага крызісу, бо няма надзеі, каб Пуанкарэ застаўся на ўладзе, атрымаўшы незначную выключна правую большасьць.

Правы друк востра нападае на радыкалаў і ўжо ня ўтойвае непакою за лёс ураду Пуанкарэ. Небясьпека для правых колаў узрасла яшчэ затым, што ў зьвязку з пастановаю партыі радыкалаў, зьвязаць сваіх дэпутатаў пры галасаваньні фракцыйнаю дысцыплінаю, нішчыцца надзея ўключыць у пуанкарысцкую большасьць правае крыло радыкалаў, якое ня раз падтрымлівала сучасны ўрад.

Орган кампартыі «Юманіте» адзначае, што крызіс на будзе ліквідаваны тым ці іншым вынікам галасаваньня, бо сучасны габінэт ахвяраваны на зьнішчэньне.

«Юманітэ» выкрывае ролю сацыялістаў, якія спадзяюцца дамагчыся ўдзелу ў адной з магчымых урадавых камбінацый. «Камуністычная партыя,—піша «Юманітэ»,—разумеючы, што пры любым складзе буржуазнага ўраду палітыка рэакцыі, капіталістычнае рацыяналізацыі і падрыхтоўкі вайны будзе праводзіцца далей, застаецца ў баку ад барацьбы асобных колаў буржуазеі і цьвёрда стаіць на сваёй плятформе—кляса проці клясы».

СТАЧАЧНІКІ СЭНТ-ЭЦЬЕНУ ТРЫМАЮЦЦА МОЦНА

ПАРЫЖ, 9-I. У басэйнах Луары і Гар стачачныя камітэты распачалі наладжваць харчовую дапамогу бастуючым. Камуністычныя муніцыпалітэты Луары паведамілі стачачны камітэт, што яны гатовы дапамагчы бастуючым.

Сёньня орган сацыялістаў «Популер» і рэфармісцкая „Пэпл" упяршыню выказваюцца наконт руху гарнякоў на поўдні Францыі. Ніводная з газэт, аднак, не заяўляе проста, ці трэба весьці далей забастоўку, а абмяжоўваюцца толькі вострымі выпадамі проці унітарыяў, абвінавачваючы іх у наладжаньні забастоўкі з палітычнымі мэтамі.

АЎГАНСКІ МЯЦЕЖ БЛІЗІЦЦА ДА ЛІКВІДАЦЫІ.

КАБУЛ, 8-I. Наступ урадавага войска на Чайкарскую даліну адбываецца з посьпехам. Калёна, якая наступае ад Пагману ўздоўж Пагманскага хібу, дасягнула Шакар-Дару, дзе распачала бойку з ворагам. На галоўным напрамку—Чайкарскай дарозе—войска, вызваліўшы ад ворага райён перавальчык Хаір-Ханэ, пасунулася да Кала Мурад-Бэк, завязаўшы бойку за заўладаньне гэтым пунктам. На паўночны захад ад Кабулу атрад ворага, абышоўшы навакол, захапіў вышыні каля Вазірабаду, але быў адтуль адкінуты. У Кабул праз увесь час прыходзіць падмога і мабілізаваныя з розных мясцоў у тым ліку з Хезараджату і Кандагару. Настрой падмацаваньняў добры.

Зрыў прафадзінства лідэрамі прафруху Нарвэгіі.

СТАКГОЛЬМ 9-1. З Осло паведамляюць, што пленум выканкому нарвэскага аб'яднаньня прафсаюзаў, на якім удзельнічала 86 дэлегатаў, большасьцю 62 галасоў проці 18 ухваліў адкласьці зацьверджаньне ўгавору з УЦСПС. Прапанова меншасьці, каб нарвэскае аб'яднаньне прафсаюзаў разам з савецкім і фінляндзкім аб'яднаньнямі прафсаюзаў узяло на сябе ініцыятыву скліку міжнароднага кангрэсу адзінства прафэсыянальнага руху, адхілена ўсімі галасамі проці 12-ці.

ФРАНКА-КІТАЙСКІ УГАВОР.

ПАРЫЖ, 6-I. Гэтымі днямі агалошан тэкст франка-кітайскага ўгавору, падпісанага ў Панкіне 22-га сьнежня.

Асноўныя артыкулы ўгавору такія: АРТЫКУЛ 1. Гэтым скасоўваюцца і трацяць моц усе пастановы сучасных франка-кітайскіх угавораў, якія датычаць прывозных і вывозных тавараў мытаў, правоў транзіту і тавожу ў Кітаі; прынцып поўнае аўтаномі будзе ўжывацца надалей у адносінах мытнага тарыфу і зьвязаных з ім пытаньняў, але з умовай, што кожны з угаворных бакоў будзе карыстацца на тэрыторыях, ва ўладаньнях, калёніях і пратэкторатах іншага, такімі-ж і пічуць на меншымі правамі па пералічаных вышэй і схожых пытаньнях, якімі карыстаюцца іншыя дзяржавы; АРТЫКУЛ 2. Падданым кожнага з угаворных бакоў на могуць быць ні ў якім разе прымушаны плаціць у межах тэрыторыі пратэкторатаў, уладаньняў і калёній іншага боку якія-небудзь зборы, мыты або ўнутраныя падаткі на прывезеныя ці вывезеныя імі тавары ў большым разьмеры, чымся плацяць падданыя гэтага краю, ці падданым іншых дзяржаў. Абмяркоўваючы падпісаньне ўгавору, французкі друк адзначае, што гэтым крокам Францыя прызнала нанкінскі ўрад цэнтральнаю ўладаю ў Кітаі.

ТУРЭЦКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЎРАЧЫСТАСЬЦЬ.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 2-I. Учора ў Канстантынопалі з вялікім уздымам адбылося «сьвята новага альфабэту», наладжанае ў зьвязку з адчыненьнем нацыянальных школ для навучаньня жыхарства новаму альфабэту. **Адчынена 1.200 нацыянальных школ,** *у якія запісалася 50 тысяч чалавек.*

На працягу аднаго году ўсё жыхарства Канстантынопалю павінна быць абучана чытаньню і пісаньню па новым альфабэце.

СОТНІ НОВЫХ СЯБРОЎ НЯМЕЦКАЕ КАМПАРТЫІ.

БЭРЛІН, 9-1. У зьвязку з 10-мі ўгодкамі нямецкае кампартыі Бэрлін-Брандэнбурская акруговая арганізацыя нямецкага камсамолу перадала 180 камсамольцаў у нямецкую кампартыю. Перададзеныя камсамолцы былі ўведзены ў партыю на ўрачыстай канфэрэнцыі актыву Бэрлін Брандэнбурскае акруговае арганізацыі КП Нямеччыны.

БРАНДЛЕРАЎЦЫ НЯ МАЮЦЬ ГРУНТУ Ў РУРЫ.

БЭРЛІН, 9-1. На падрайённых канфэрэнцыях Рурскае абласное арганізацыі нямецкае кампартыі за ліст выканкому Камінтэрну галасавала 752 дэлегаты, проці—41 і 12—устрымаліся.

ДЭМАНСТРАЦЫІ НЯМЕЦКІХ БЕСПРАЦОЎНЫХ.

БЭРЛІН, 9-1. У Эсэне некалькі тысяч беспрацоўных наладзілі дэманстрацыйную працэсію да ратушы. Дэманстрацыя была разагнана паліцыяй.

У Франкфурце на Майне беспрацоўныя занялі ў ратушы галярэю залі пасяджэньняў. Перад ратушаю знаходзіліся атрады паліцыі; гота выклікала востры пратэст лідэраў камуністычнае фракцыі. Пасьля адхіленьня камуністычнае прапановы аб дапамозе беспрацоўным на галярэях узьняўся вялікі лямант. Прысутныя на галярэях беспрацоўныя і камуністычныя депутаты засьпявалі «Інтэрнацыянал». Выключаны на некалькі пасяджэньняў камуністычны гласны Ашэнбрэнэр быў выведзены з залі паліцыяй.

Стачка суднабудаўнікоў Гамбургу сарвана.

БЭРЛІН, 7-1. Дэлегацкая канфэрэнцыя арганізаваных суднабудаўнічых рабочых Гамбургу большасьцю галасоў пастанавіла спыніць забастоўку і падначаліцца прымусовай арбітражнай пастанове, якая ўстанаўляе незначнае павялічэньне заработку.

Сёньня левая прафсаюзная меншасьць агаласіла адозву, у якой зазначае, што рэфармістам удалося зрабіць тое, чаго ў працягу 14 тыдняў не маглі зрабіць голад, злыбяда і ўсе захады прадпрыёмцаў—разьбіць баявы фронт бастуючых. Адозва заяўляе, што рабочыя здраджаны, але не пераможаны.

Нямецкія сябры к-ту экспэртаў.

БЭРЛІН, 9-1. Агентыва Вольфа паведамляе: «Агульнанямецкі ўрад назначыў прэзыдэнта рэйхсбанку Шахта і Фэглера нямецкімі сябрамі камітэту незалежных экспэртаў для распрацоўкі прапаноў аб канчатковым і поўным упарадкаваньні рэпарацыйнае праблемы.

Замах на польскага атташэ ў Канстантынопалі.

У Канстантынопалі зроблен быў гэтымі днямі замах на польскага атташэ п. М. Іжыцкага, які выехаў на аўтамабілі за горад. З кустоў было зроблена на ім 4 выстралы. Кулі разьбілі шыбы ў вокнах самаходу, не параніўшы атташэ. Страляўшых не злавілі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

САХАЦКІ АДМОВІЎСЯ АД МАНДАТУ.

ВАРШАВА, 9-1. Камуністычны дэпутат Сахацкі, які быў выдадзен польскім сойма суду і ўцёк заграніцу, паведаміў старшыню сойму, што ён адмаўляецца ад дэпутацкага мандату.

Адным з кандыдатаў зьяўляецца украінскі дэпутат сойму мінулага скліку Скрыпа.

Прыезд Міранэску адкладзен.

Румынскае пасольства ў Варшаве паведамляе, што назначаны на 12 студ. г. г. прыезд у Варшаву румынскага мін. замежных спраў Ю. Міранэску адкладзен.

Мін. Міранэску прыедзе ў Варшаву ў пачатку лютага.

Зьмены ў польскай дыплёматыі.

«Газ. Варш.» (№ 6) паведамляе, што ў куткім часе адбудуцца зьмены на некаторых заграничных польскіх пляцоўках. Дырэктар департаменту мін. замежных спраў д-р Яцкоўскі будзе назначан паслом у Брусэлі. Дарадчык парыскага пасольства Арцішэўскі будзе назначан паслом у Рыгу, адкуль тамашні пасол Букашэвіч назначаецца дырэктарам кансулярнага аддзелу. Дырэктар гэтага дэпартаменту Бабінскі назначаецца паслом у Белград.

Выезд Дзьюі.

11 студзеня выяжджае з Варшавы ў ПаЗШтаты фінансавы кансультант Штатаў п. Дзьюі, які паінфармуе прамысловыя і фінансавыя сфэры Амэрыкі з гаспадарчым становішчам Польшчы, а таксама зарыентуецца ў магчымасьці зацікаўленьня амэрыканскага капіталу дай іншым фінансаваньнем брэдытных патраб Польшчы.

Палітычнае забойства.

«Наш Пшэгляд» (№ 6) паведамляе, што на мітынгу „Паалейсыён-лявіцы", які адбыўся надзвычай у Цохаўскім маёмасьці, ужыдан забойства на палітычным грунце. У часе мітынгу ў залі зьявілася некалькі палітычных праціўнікаў гэтай партыі і капелі сарвацъ мітынг. Тады адзін з гаспадароў мітынгу парнуў нейкага Егора нажом у бок, цяжка яго параніўшы. У больніцы Егор памёр.

Забастоўка дактароў у пазнанскіх касах хворых

„Роботнік" (№ 6) паведамляе, што ў пазнанскіх і паморскіх касах хворых выбухла забастоўка дактароў. Акруговыя саюзы кас хворых шукаюць 150 дактароў.

„Жэчпосполіта" ў новых руках.

Вядомая газэта «Жэчпосполіта», орган польскіх хрысьціянскіх дэмакратаў, зьмяніла свайго ўласьніка. Газэту набыў п. Т. Сулоўскі, старшыня абшарніцкага банку.

Узрост беспрацоўя

Паводле апошніх статыстычных даных за час ад 22 да 29 сьнежня ўключна лік беспрацоўных у Польшчы ўзрос на 6.046 асоб, дасягнуўшы 128.144.

44 замахі на агнятрывалыя касы.

У працягу 1928 г. ў Варшаве зроблена было 44 замахі на агнятрывалыя касы. Агулам скрадзена з кас 153143 злотых.

Эпідэмія грыпу

У Польшчы шырыцца пэрэпідэмія грыпу, якая мае цяжкі характар. Эпідэмія распаўсюджваецца досыць шырока.

У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Паўторны разгляд справы Грамады.

ВАРШАВА, 9 I. У зьвязку з абвінавачаньнямі, з якімі выступіў проці Мэйштовіча «Глос Правды», «Кур'ер Віленскі» патрабуе перагляду справы Беларускае Грамады. Як вядома, „Глос Правды" абвінавачваў Мэйштовіча ў тым, што той па прычынах асабістага і маемаснага характару, а таксама ў мэц сваіх клясавых пераконаньняў інсцэніраваў працэс Грамады.

Як перадаюць, у сакавіку адбудзецца паўторны разгляд справы ў апэляцыйным судзе.

Зачыненьне „Т-ва Бел. Школы" ў Клецку.

«Слово» (№ 6) паведамляе, што польская адміністрацыя зачыніла гэтымі днямі клецкі аддзел «Т-ва Бел. Школы». Прычынай зачыненьня паслужыла быццам тое, што сябры гэтага таварыства займаліся толькі палітычнай агітацыяй, а не асьветнай справай.

Забастоўка працаўнікоў цагельняў.

У Горадзенскай цагельні „Станісьлаў" выбухла забастоўка. Працаўнікі жадаюць 16 проц падвышэньня заработнай платы, на што прадпрыемца не згаджаецца. Бастуюць 64 работнікі.

Застой у Беластоку.

„Газ. Варш." (№ 8) паведамляе што ў Беластоку назіраецца застой у прамысловасьці. Гэтымі днямі спынілі працу суконная фабрыка Т. Фукса (80 работнікаў) і Кулінгоўскага (72 работнікі).

Пабудова новай стратэгічнай дарогі.

Мін. публічных работ вызначала вілеснаму ваяводзтву 250000 зл. на дастаўку каменьняў для пабудовы дзяржаўнага шляху Вільня-Сьвянцяны—Відзы.

Забастоўка земляных работнікаў.

У Вільні пачалася забастоўка земляных работнікаў. Працадаўцы не хочуць выплаціць зваўсным работнікам двухтыдневае заработкаваньня, што ім слушна належыць з прычыны вадзіны працы ў прадпісаным тэрміне.

Інкогніто ў Вільні.

У Вільню прыехалі з Коўні прафэсары коўенскага унівэрсытэту М. Біржышка і Ромар. Абодва прыбылі ў Вільню беспаспортна праз граніцу каля Кёд. Пабыт названых асоб захоўваўся ў поўным інкогніто.

* * *

„Слово" (№ 6) паведамляе, што з праф. М. Біржышкай, які інкогніта знаходзіцца цяпер у Вільні, здарыўся наступны інцыдэнт: некалькі літоўскіх эмігрантаў (сацыял-дэмакратаў), спатнаўшы Біржышку на вуліцы, пачалі дэманстрацыйна выкрыкваць: «прэч з урадам Вальдэмараса, прэч з катамі» і г. д. М. Біржышка, каб не ўнікнуць непрыемнасьцяў, змушан быў схавацца на пэндворках аднаго дому.

Канфіскацыя беларускай аднадзёўкі.

«Слово» (№ 6) паведамляе аб канфіскацыі беларускай аднадзёўкі пад назвай «Новы Год». Увесь наклад аднадзёўкі апячатаны.

У ЛІТВЕ.

Скандал у літоўскім штабе.

«Пшэдсьвіт» (№ 76) паведамляе, што ў літоўскім генэральным штабе выкрыты вялікія злоўжываньні. Шэфа будаўніцтва аддзелу штаба палкоўніка Брэнэра, галоўнага інжынэра Прылгаўскаса і 4 афіцэраў арыштавалі. Злоўжываньні, якія адбываліся ў працягу 6 гадоў, аблічаюць на 6 млн. літаў (літ =20 кап.).

Суд над камсамольцамі ў Коўні.

7 студзеня коўенскі суд пачаў разглядаць справу коўенскага камсамолу. Абвінавачваецца 13 асоб. Частка іх зьяўляецца вучнямі, работнікамі і ўрадоўцамі. На суд выклікана 50 сьведкаў. Абвінавачаным пагражае катарга ў працягу 6 гадоў.

Справа панявескіх камуністаў.

Гэтымі днямі выехала ў Панявяж сэсія вайсковага коўенскага суду в матаю разглядзець справу 36 камуністаў. Шмат каму з абвінавачаных пагражае кара сьмерці. Справа працягнецца каля двох тыдняў.

Высяленьне з Коўні расейцаў.

«Слово» (№ 6) паведамляе, што літоўская адміністрацыя высяліла з Літвы супрацоўніка расейскай газэты „Эхо" нейкага Краснапольскага, б. палкоўніка царскай арміі Чэрнявецкага і інш.

«Дзеньнік Від.» (№ 6) паведамляе, што ў працягу мінулага месяца з граніц Літвы выселена 23 асобы, у тым ліку 17 асоб польскай нацыянальнасьці.

Арышты ў Коўні.

«Слово» (№ 6) паведамляе, што ў коўенскіх вайсковых прадпрыёмствах зроблены былі гэтымі днямі арышты. Арышты гэтыя знаходзяцца ў сувязі з выкрыцьцем значных злоўжываньняў.

Літоўскія тэрарысты?

«Кур'ер Від.» (№ 7) паведамляе, што некалькі дзён таму назад на польска-літоўскім пагранічча было арыштавана некалькі асоб, западазроных у тым, што яны спэцыяльна прысланы з Літвы ў Польшчу дзеля выкананьня замаху на жыцьцё выдатных літоўскіх эмігрантаў. «Б. В.» дадае, што існуе падазрэньне, быццам арыштаваныя знаходзіліся ў сувязі з накаторымі асобамі ў Польшчы. У сувязі з усім гэтым адміністрацыя пачала энэргічнае сьледзтва.

Гандлёвы балянс Літвы.

«Летувос Жыніос» у перадавым артыкуле сьцьвярджае, што літоўскі гандлёвы балянс у працягу апошніх двух гадоў даў дэфіцыт у 60 млн. літаў. Гэтае зьявішча тлумачыцца як усім спрадвечнай арганізацыяй продукцыі і дрэннымі ўмовамі, пануючымі на рынку.

Страшны выбух.

Гэтымі днямі каля Відзаміру (Літва) здарылася страшная катастрофа: выбух бэнзінны бак у грузавіку, на якім перавозілі амуніцыю для пагранічных аддзелаў. Полымя акаліла грузавік і гранаты пачалі ўзрывацца. Шофэр аказаўся забітым, тры салдаты цяжка паранены.

У працягу некалькіх гадзін пажарная каманда і салдаты ледзьве здужалі патушыць пажар.

У Саюзе ССР.

Хлебазагатоўчы плян будзе выкананы.

МАСКВА. 9-I. На пасяджэньні калегіі НК Гандлю СССР пад старшынствам т. Мікояна быў заслуханы даклад наркамгандлю СССР т. Максімава, які абгледаваў ход хлебазагатовак і працу транспарту па вывозе хлеба ў галоўных усходніх раёнах Сібіры, Казахстане Башкірскай рэспублікі, на Урале і ў Паволжжы. Дакладчык зазначыў, што галоўную прычыну зьніжэньня хлебазагатовак зьяўляецца паслабленьне ўвагі да х абазатоўчае працы з боку савецкага, партыйнага і хлебазагатоўчага апарату.

Цэны па ўсіх мясцовасьцях здаваньняюць сялянстве. Поруч з кампаніяй па кантрактацыі і закупцы хлеба на корані, яны зьявіліся асноўным стымулам увеличэньня продажу хлеба ў верасьні і кастрычніку.

Тав. Максімаў лічыць, што хлебныя лішкі знаходзяцца ня толькі ў кулацкіх гаспадарках але і ў значнае частке середняцкіх гаспадарак.

У выніку справаздачы аб дакладзе т. Максімава калегія адзначыла, што магчыма перавышэньне хлебазагатоўчых плянаў на 1928—29 год ашаль ва ўсіх усходніх раёнах. Калегія прызна а патрэбным павялічыць гадавы хлебазагатоўчы плян для Сярэдняй Волгі абласьці на 131,6 тысяч тон, для Нізкна-Волскае—на 49,2 тысячы тон, для Башкіры—на 82 тысячы тон, для Уралу—на 114,8 тысячы тон і г. д.

Чырвоныя абозы з хлебам

МАСКВА. Да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя рэспублікі немцаў Паволжжа сялянства рэспублікі наладзіла ўсюды чырвоныя абозы для здачы хлеба дзяржаве. У некаторых мясцох увесь юбілей праводзіўся пад лёзунгам калектыўнае здачы хлеба дзяржаве. Дзьве вёскі Бал ва і Ліпаўка 4-га студзеня пасылалі два хлебныя абозы ў 650 тон. Асабліва ўрачыстае спатканьне было наладжана абозу ў Зэльмаше, куды з вёскі Брунэнтэль прыехаў абоз у 175 фурманак. Сяляне былі сустрэчаны рабочымі арганізацыямі з аркестрамі музыкі. Увечары для сялян было наладжана ўрачыстае пасяджэньне ў нардоме, врысьвечанае пытаньню аб лучнасьці гораду і вёсці.

* * *

НОВАСІБІРСК, 9-I. Беднякі і серадняки вёскі Хайруз Ўскае, Бійскае акругі наладзілі чырвоны абоз з хлебам у 1 000 фурманак. Калектыўна здадзена дзяржаве 250 тон хлеба.

КУСТАНАЙ, 9-I. За апошні час значэньне калектыўная здача хлеба дзяржаве. За першую пяцідзёўку студзеня загатоўлена 16 процантаў месячнага плану.

Магазынныя „хвасты" будуць зьнішчаны.

Што ўхваліў пленум Цэрабсэкцыі.

МАСКВА, 10 1. Пашыраны пленум прэзыдыуму цэрабсэкцыі СССР і РСФСР адаў шмат увагі пытаньню аб бараньбе з чаргамі. Пленум пастанавіў узмоцніць разгортваньне сеткі маркоў, ятак, палатак, развозак і інш. дробна-розьнічных выглядаў гандлю ў буйных фабрычна-заводзкіх раёнах і на ваколіцах. Пленум прапануе ўвесьці ўсюды папярэдняе разважаньне тавараў. Прызнана патрэбным валадзіць продаж тавараў загружаных магазынаў у дапаможных гарках, палатках і ятках, разьмеркаваных по ач з магазынам. Гандаль у пяцідзёнку і сьвяточныя дні, а таксама гандаль у вячэрнія гадзіны, на думку пленуму павінен быць як найбольш пашыраны. У дні перад сьвятам частка магазынаў павінна быць пераведзена на больш позьнія гадзіны гандлю. У буйных рабочых каапэратывах павінны быць сьпешна складзены запасныя штаты прадаўцоў і скарбнікаў, маючы на моце пасоўніць імі найбольш загружаныя магазыны. Рэзэрвныя прадаўцы павінны быць таксама выкарыстаны для папярэдняга разважаньня тавараў у магазынах і складах з загружанымі штатамі. Павінен быць наладжан папярэдні продаж абанемэнтаў на выдачу хлеба, булак, малака, гавы мяса і інш. тавараў штодзённага попыту.

Пленум прызнаў патрэбным увесьці таленную сыстэму пры разьмеркаваньні дэфіцытных тавараў, каб стварыць у рабочага спажыўца ўпэўненасьць у магчымасьці атрымаць тавар у любы час. Для атрыманьня дэфіцытных харчовых прадуктаў усе пайшчыкі павінны быць прымацаваны да пэўных разьмеркавальнікаў па месцы кватэры ці працы пайшчыка.

Абмен культурнымі каштоўнасьцямі між РСФСР і УССР.

ХАРКАЎ, 8-1. (ТАСС) Дасягнута прынцыповая згода між наркамасьветы УССР і РСФСР аб узаемным абмене культурнымі і іншымі каштоўнасьцямі. НК Асьветы Украіны прэтэндуе на атрыманьне з Траццякоўскае галярэі, галярэі імацьвятнова і інш. хавальнай некалькі сот карцін, у тым ліку 20 палотнаў і малюнкаў Тараса Шаўчэнкі, 5 карцін і гравюр Баравікоўскага, 7 твораў вядомага украінскага мастака Лявіцкага, 12 карцін Ільлі Рэпіна, 2-х малюнкаў Н. К. Піманенкі, некалькі малюнкаў Самошына, шэраг карцін Васільеўскага і інш мастакоў. Украіна патрабуе таксама вярнуць з архіву Цэнтральнае бібліятэкі расейскае драмы ў Ленінградзе каля 2000 п'ес украінскіх аўтараў, у свой час забароненых царскай цэнзурай.

Украіна ў сваю чаргу верне РСФСР тыя каштоўнасьці, якія па сваім культурным і гістарычным значэньні павінны быць у сховах ў РСФСР.

Першыя даклады нямецкіх вучоных.

МАСКВА, 9 і. 9-га студзеня ў аудыторыях Першага Маскоўскага Дзяржаўнага Ун версытэту адбыліся першыя даклады нямецкіх вучоных—удзельнікаў «тыдню нямецкае тэхнікі». Усе даклады прайшлі з вялікім посьпехам. Асабліва палыў слухачоў выклікаў даклад прафэсара Матчоса аб гісторыі тэхнікі. Найбольшая з аудыторый Унівэрсытэту не ўмясьціла ўсіх, хто жадаў папасьці на гэты даклад. Гэткі-ж малюнак назіраўся і на дакладзе прафэсара Франца Фішэра аб сухой перагонцы пры нізкіх тэмпературах.

Маладыя вучоныя на перавыбары ў вёску.

МАСКВА. 9-га студзеня з Харкава на экспрэс выяжджае для ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі 97 асьпірантаў Украінскага Інстытуту марксызму, якія будуць непасрэдна ўдзельнічаць у правядзеньні перавыбараў сельсаветаў. Апроч працы ў перавыбарах яны з'ясуюць таксама з дакладамі аб перабудове сельскае гаспадаркі, павялічэньні ўраджайнасьці, электрыфікацыі вёскі і г. д.

Паказальныя суды над зрываючымі перавыбары

МАСКВА. ПК Юстыцыі РСФСР даў катэгарычную дырэктыву пасторыць дазнаньне па справах аб контр-рэвалюцыйных выступленьнях у зьвязку з перавыбарамі саветаў. Намячаюцца паказальныя працэсы ў Туле, Маскве і на Паўночным Каўказе, каб даць рашучы адпор і арабіць належнае сур'ёзнае папярэджаньне наступаючаму клясаваму ворагу

Яшчэ адна трактарная лябараторыя.

РАСТОЎ, н-Д. 9-1. 13-га студзеня ў Растове адчыняецца трактарная лябараторы —трэцяя ў СССР. З Амэрыкі лябараторыя атрымала для выпрабаваньня трактарных матораў найноўшы варстат «Спрэнг» і варстат «Нямі» з Масквы. Лябораторыя будзе рабіць выпрабаваньне трактараў з-за граніцы, каб устанавіць найбольш падыходзячы тып трактару для Паўночнага Каўказу. Намечана таксама праводзіць выпрабавальні трактараў розных чужаземных фірмаў, якія ўдзельнічалі ва ўсесаюзных трактарных выпрабаньнях на Паўночным Каўказе ў 1927 г. Праца па арганізацыі лябараторыі выконана студэнтамі інстытуту імя Ламаносава.

Моцны шторм на Чорным моры.

СЕВАСТОПАЛЬ, 9-1. Учора перад 9 студзеня адзавіўся прыпіхны раней шторм. Вецер дасягае моцы гурагану. Нават у зачыненых бухтах хвалі настолькі моцныя, што параходы стаяць на якарах, бязупынна працуючы машынамі. У порце адбылася стычка двох катэраў. Ахвяр няма. Непакоюцца за лёс рыбаловаў, якія выйшлі ў мора.

* * *

СЕВАСТОПАЛЬ, 9-1. Ангельскі пароход Мажэстык сеў на мель ля Фэадасійскага мысу. У моры лютуе шторм сілаю ў 7 балаў і пароход у небясьпецы. Ня даваюць яму выходзіць зёдаком Макараў.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ХЛЕБ--У КААПЭРАЦЫЮ.

(Ліст з Слуцку).

Случчына ў галіне калектыўных хлебазагатовак ідзе цьвёрдым шляхам напярэдадні усіх мясцовасьцяй Бе арускай рэспублікі. Калі мы паглядзім на тыя заданьні, якія былі дадзены ў лістападзе месяцы, дык зауважым, што яны выкананы Случчынаю на 120 процантаў.

Асабліва актыўна працуюць у гэтым напрамку Старобінскае і Чырвона-Слабодзкае спажывецкія таварыствы, якія даганяюць выкананьне сваіх заданьняў на 100 проц. і яшчэ з лішкам.

У сваім разьлусе абслугоўваньня Случкае праўленьне спажывецкага таварыства вядзе сыстэматычны выезд у самыя далёкія вёскі свайго раёну і вядзе вялізную растлумачваючую працу і агітацыйную працу за тое, каб ніводзін селянін як бядняк, так і серадняк ні аднаго грама збожжа не прадалі сёлета прыватніку, і каб усе гуртам, калектыўна везьлі лішкі свайго збожжа толькі ў каапэрацыю.

Бязумоўна, вышкамі гэтае растлумачваючае кампаніі мы сёньня можам ганарыцца. За гэты кароткі тэрмін хлебазагатовак Случкае аддзяленьне Белкаапсаюзу загатовіла 1023 тоны збожжа. Што тычыцца выкананьня па загатоўцы ільнянога насеньня, дык Случчына выканала яго на 220 проц. Напрыклад, сяляне з вёскі Заўшыцы прывезьлі 4 тоны хлеба з чырвонымі сьцягамі і лёзунгамі; на прыкладзе іх сяляне вёскі Бранчычы прывезьлі 7 тон збожжа на базу Слуцку. Потым сяляне вёскі Мацявічы, за імі вёскі Чапялі, Чапліцы, Баденічы, Крывічы і цэлы шэраг іншых.

У гэты час навіраем у вёсках абураньне нашага клясавага ворага—кулака. Напрыклад, у вёсцы Крывічы, Старобінскага раёну, Сусуновіч Рыгор актыўна агітуе сялянства, каб яно ня везла лішкі збожжа ў каапэрацыю, і каб яно малола збожжа ў яго на млыне і потым прадавала муку прыватніку, дзе можна ўзяць па 4 рублі за пуд. Бязумоўна, што на яго вуду пайшлі нямногія толькі бубнаваможныя сяляне, а беднята з серадняком калектыўна павезла хлеб у каапэрацыю.

Далей, у вёсцы Прусах заможнікі Белька, Масюк і Бобка таксама агітуюць беднату за прапанову Сусуновіча Рыгора.

Сяляне многіх вёсак прадаюць хлеб каапэрацыі: З Аселішч прывезена 750 пуд. збожжа, з вёскі Казловічы—100 пуд., з вёскі Бязьвярховічы—300 пуд., з вёскі Падліцы—150 пуд., з вёскі Ячэва—80 п., з вёскі Быкава—250 п., з вёскі Агароднікі-Івантскія—350 п., з Балочычы—400 пуд., з вёскі Вялікая Сьліва—295 пуд., з вёскі Пабушоўка—90 пуд. Гэта па Слуцкаму раёну.

Па Чырвона-Слабодзкаму раёну толькі з мястэчка Чырвон-аСлабада—500 пуд., з вёскі Цёска—200 п., вёскі Чаплины—1000 пуд.

З вёскі Малышоўка—200 п., з вёскі Бучачін—100 пуд., з вёскі Семежава—200 пуд. З мястэчак Пагост, Сельцо, Цёсава прывезьлі 1000 пуд. з весак Чаплічы, Крывічы і Чырвонадворцы сяляне прывезьлі 4150 пуд. збожжа.

Селькор Клішэвіч Рыгор.

Сяляне калектыўна здаюць хлеб у каапэрацыю.

Самаабкладаньне скарысталі, пазыку распаўсюдзілі.

(Расткоўскі с.-с., Ляднянскі раён, Аршаншчына)

Ня ўсе сябры сельсавету цікавяцца тэю працаю, якую даручае сельсавет. Пры сельсавеце існуе некалькі камісій —падатковая, санітарная, культасьветная і дабрабыту. Але, сапраўды, толькі працуе адна падатковая, а астатнія існуюць толькі на паперы.

Самаабкладаньня наш сельсавет павінен быў сабраць 1400 рублёў, з якіх амаль усе сабраны. Грошы пайшлі на тыя патрэбы, куды само насельніцтва вызначыла.

Напрыклад, у вёсках Казьлны, Сьніцгіры і Міхалінава пабудаваны новыя масты.

Для Міхалінаўскай пажарнай дружыны куплена пажарная машына, рукавы і набыт звон. Зроблен таксама і рамонт школам, дзе зімою ня будуць мерзнуць вучні. Наогул трэба сказаць, што самаабкладаньне дало нашаму сялянству шмат чаго патрэбнага.

Праца па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі па нашаму сельсавету прайшла пасьпяхова, заданьне выкананa больш чым на 160 проц.

Мак—скі.

Упарадкоўваем лясную гаспадарку.

(Мазыршчына).

За час грамадзянскае вайны лясная гаспадарка Мазыршчыны падпала вялікаму спустошэньню. У апошнія гады прароблена вялізная праца па аднаўленьні і ўпарадкаваньні лясоў. Да гэтага моманту праведзена поўнае лесаўпарадкаваньне на плошчы 300 000 гектараў і частковае —100.000 гектараў. Застаецца ўпарадкаваць 273.000 гектараў лясоў, што будзе выканана у 1929 годзе.

Лясоў мясцовага значэньня ўпарадкавана да 30.000 гэктараў, што складае 50 проц. агульнае плошчы гэтых лясоў. Праведзен засеў і пасадка больш 1000 гэктараў лясоў і ўмацавана пяскоў (лесамэліарацыя) на плошчы да 1500 гэктараў.

Сялянства вельмі ўважліва адносіцца да лесакультурных і лесамэліарацыйных работ, даючы вельмі часта дармова рабочую сілу, коняй і інш.

Я. С.

Дапамога беднаце.

(Смалявіцкі раён, Мен. акр.).

У 6. бровары абшарніка Ваньковіча зараз гудзіць крахмальны завод Менсельпрома. Ён добра абсталёван, мае рухавік да 80 конскіх сіл, працуючы на торфе, і выпрацоўвае да 1500 п. бульбы ў суткі.

Завод мае вялікае значэньне ў сельскай гаспадарцы раёну. Сялянства павысіла засевы бульбы, што выявілася ў агульным па раёну на 5 проц. і па досыць дай цане, па 42 кап. за пуд, збывае бульбу з воду.

Сёлета корму ў сялянства мала, і завод выручае беднату ад бяскормицы—дае штодня да 1000 пудоў адкідаў ад крахмальнай вытворчасьці, якія зьяўляюцца добрым кормам для скаціны і прытым танным—2 кап. за пуд.

Беднята шчыра дзякуе савецкую ўладу за завод, які дапамагае яму захаваць скаціну ад продажу за бясцэнак.

С.

Кішчыцца дабро.

(Смалявіцкі раён, Мен. акр.)

У былым маёнтку Дуброва—зараз пасёлак. Зямлю разьмеркавалі пасёлку, дрывяныя будынкі праданы, а засталіся муры—абора з сьвранам на версе і жылыя кватэры.

Нехта ўжо зьняў з аборы двое дзьвярэй, я ія, прынамсі, каштуюць 100 руб Зараз хтось аддзірае масыўныя завесы з пазасталых дзьвярэй.

Трэба абавязаць пасялкоўцаў, якія карыстаюцца гэтай аборай, як пуняй, берагчы іх. Гэтыя будынкі могуць быць месцам для ўтварэньня калектыўнай гаспадаркі.

С.

Крэдыты на пасеўкампанію

Гомель, 10-1. На правядзеньне вясеньняй пасеўнай кампаніі сельгасбанк намецеў разьмеркаваць па акрузе крэдыты на 1.546 тысяч руб.

З іх 784 тысячы руб. прызначаюцца на крэдытаваньне грамадзкага сэктару сельскай гаспадаркі і 378 тысяч на крэдытаваньне бядняцкіх гаспадарак.

Каапэраваньне беднаты.

Гомель, 10-1. Гомельскі райсаюз разьмеркаваў на раёнах 8.000 руб. на каапэраваньне беднаты. Гомельскаму раёну асигнавана 2 000 руб., Рэчыцкаму 1.100, Веткаўскаму 900, Буда-Кашалёўскаму 500, Чэчэрскаму 600, Уваравіцкаму 700, Лоеўскаму 300, Церахоўскаму 800, Брагінскаму 500, Хойнікскаму 300, Камарынскаму 300.

Агнятрывалае будаўніцтва павялічваецца.

Мазыр, 10-I. У акрузе працавала 20 таварыстваў па агнятрываламу будаўніцтву. Выпрацавана цэглы ў 1924-25 годзе 200 тысяч штук, у 1925-26 г. —300 тысяч, у 1926-27 г 974000 і ў 1927-28 г.—1460000.

Чарапіцы выпрацавана за ўвесь час да 900000 штук. Колаў для студні зроблена 1500. У акрузе маецца шмат агнятрывалых і палепшаных пабудоў і агнятрывалых стрэх, пабудавана 160 бэтонных студняў. У апошні час пачынае разгортвацца праца па распрацоўцы торфу.

Дзікі на Мазыршчыне.

Беларускі саюз паляўнічых атрымаў весткі, што ў Турайскім раёне (Мазыршчына) паявіліся стады дзікіх кабаноў ў 30, 50 шт.

У сувязі з гэтым Беларускі Саюз паляўнічых, па просьбе мясцовага саюзу паляўнічых, узьняў хадайніцтва перад Наркамземяробства аб дазволе на адстрэл невялікай часткі дзікаў.

УСІМ АКРВЫКАНКОМАМ І РАЙВЫКАНКОМАМ.

Пошта-тэлеграма.

Плячам вясеньняй пасеўнай кампаніі, зацьверджаным Саўнаркомам 12 сьнежня, прадугледжана выкананьне акругамі зерноачысткі насеннага матар'ялу да пасеву ня менш 50 проц., калектыўнымі і савецкімі гаспадаркамі—на 100 проц. Адпаведнае заданьне акругам было дадзена Наркамземам яшчэ ў кастрычніку 1928 г. з прапановай пачаць зерноачыстку з 1-га лістапада. Да гэтага часу праца па зерноачыстцы ў райёнах не разгорнута. Катэгарычна прапануецца прыняць рашучыя захады да максымальнага разгортваньня працы ў бліжэйшыя часы, арганізаваўшы стале кіраўніцтва і кантроль за выкананьнем заданьня зерноачысткі. Віноўных за зрыў працы па зерноачыстцы прыцягнуць да адказнасьці.

Старшыня Сазету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы.

ЯК АБСТАІЦЬ СПРАВА З ЗЕРНААЧЫШЧЭНЬНЕМ?

Мы ўжо ня раз пісалі, што ў некаторых раёнах Меншчыны слаба разварачваецца кампанія зерноачышчэньня. За нядбайныя адносіны да гэтай справы прыцягваюцца да адказнасьці Барысаўскі і Пухавіцкі райвыканкомы. Ня глядзячы на тое, што вакол гэтага пытаньня зараз завострана ўвага шырокай савецкай грамадзкасьці, што на зерноачышчэньне сёлета ўскладаюцца вялікія надзеі—Наркамзем ніяк ня можа дабіцца ад акруг самых мінімальных вестак аб тым, як разгортваецца гэта кампанія на мясцох.

Ужо не гаворачы пра іншыя акругі, але нават некаторыя бліжэйшыя да нас раёны Меншчыны ніяк ня могуць даць гэтых вестак. На 1-га студзеня падалі справаздачы аб зерноачышчэньні толькі 8 раёнаў Меншчыны, а зусім маўчаць наступныя раёны: Барысаўскі, Бярэзінскі, Койданаўскі, Капыльскі, Лагойскі, Плешчаніцкі, Вузьдзенскі і Халопеніцкі. Па астатніх 8 мі раёнах да 1-га студзеня ачышчана 496 тон насеньня ці 2,9 проц. заданьня.

На першым месцы стаіць Грэскі раён (25,6 проц. заданьня). Далей—Пухавіцкі (14,2 проц.), на апошнім месцы—Самахвалавіцкі (1,0 проц.).

Але калі ёсьць магчымасьць праверыць хоць з большага кампанію зерноачышчэньня ў Менскай акрузе, дык нельга гэтага зрабіць у адносінах да іншых акруг, якія не сьпяшаюцца даць весткі аб сабе.

Зразумела, што так справа ня можа цягнуцца далей. Трэба, каб Наркамзем-ляробства і органы РСІ на мясцох ужылі самыя рашучыя меры для ажыўленьня гэтай кампаніі; наогул, трэба выявіць, ці робіцца што ў іншых акругах у галіне зерноачышчэньня.

УЖЫВАНЬНЕ ВАПНЫ, ЯК УГНАЕНЬНЯ.

У сувязі з агульнай устаноўкай аб павышэньні ўраджайнасьці, у БССР сёлета робіцца першая шырокая спроба ўгнаеньня палёў вапнай.

Наркамзем робіць захады да ўгнаеньня вапнай 5.000 гект. палёў у савгасах, калгасах і ў гаспадарках сялян-дасьледчыкаў. Для заваёваньня гэтага пляцу патрабуецца да 10 тысяч тон сырой вапны, якая будзе здабывацца ў бліжэйшых ад палёў мясцох.

Здабыча гэтае вапны ўскладаецца на Белсельсаюз, які павінен да чэрвеня падрыхтаваць вышэйпаказаную колькасьць.

Вапнаваньне глебы будзе праводзіцца пераважна пад жытнюю зьмену. Вопыты з вапнаваньнем глебы будуць праводзіцца сёлета ў Менскай, Бабруйскай, Магілеўскай і часткова ў Аршанскай і Гомельскай акругах.

У паўночных ільнаводных і паўднёва пясчаных раёнах вапнаваньне будзе праводзіцца толькі на вопытных вучастках.

Зусім слушна, што ў гэтай справе вялікую ролю павінна адыграць ініцыятыва мясцовых арганізацый, агранамічнага пэрсаналу, РВК, сельсветаў і г. д. У БССР знаходзяцца шматлікія выхады аморфнай (дробнай) вапны, якую можна без жаднай турбацыі ўжываць на ўгнаеньне.

НЕ ХАПАЕ НАСЕНЬНЯ КАНЮШЫНЫ.

Гэтымі днямі пры Наркамземе адбылася нарада заготоўцаў, якая абмяркоўвала пытаньне аб забесьпячэньні насеньнем.

Асабліва востра стаіць справа з насеньнем канюшыны. Для БССР патрабуецца 44 тысячы пуд. канюшины; з іншых раёнаў Савецкага Саюзу мае быць атрымана 12 тысяч пуд. Такім чынам, дэфіцыт дасягае 32 т. п. У сувязі з гэтым прыходзіцца ўзьнімаць пытаньне аб завозе 32 тысяч пуд. канюшыны з- замежаў.

Таксама ня высьветлена яшчэ пытаньне з лубінам. Больш спрыяючае абстаіць справа з насеньнем аўса і ячменю.

Што-ж датычыцца штучнага ўгнаеньня, то з 16-ці тысяч тон суперфасфату пакуль што на вясну забясьпечана толькі палова (імпартны суперфасфат) а калі будзе атрымана рэшта невядома. Замест патрэбных 3000 тон калійнай солі даюць толькі палавіну, а тамасшлаку, здаецца, зусім не дакладуюць.

Усесаюзны агляд вытворчых нарад.

У сучасны момант па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам газэты „Правда" праводзіцца ўсесаюзны агляд вытворчых нарад і камісій.

Агляд павінен ахапіць *усе* прадпрыёмствы прамысловасьці і транспарту, пачынаючы з самых дробных і канчаючы самымі буйнымі.

Асноўнай задачай агляду зьяўляецца праверка працы вытворчых нарад і камісій, выяўленьне і выпраўленьне усіх недахопаў ў працы і прыцягненьне ня шырокіх рабочых мас да працы вытворчых нарад і ў сацыялістычную рацыяналізацыю.

Асноўнай і абавязковай умовай для пасьпяховага правядзеньня агляду павінна быць яго *масавасьць*.

Без гэтай умовы агляд *ня дасьць* тых вынікаў, якія ад яго патрабуюць.

Перад пачаткам правядзеньня агляду павінна быць праведзена *шырокая* растлумачальная кампанія сярод рабочых аб задачах і парадку правядзеньня агляду. Дамагчыся, каб усе рабочыя прымалі ўдзел у аглядзе. Прыцягнуць у агляд усе грамадзкія арганізацыі—гэта другая ўмова пасьпяховага правядзеньня агляду. Трэцяй умовай зьяўляецца наступнае: трэба памятаць, што праводзіцца агляд ня вытворчасьці, як гэта наглядаецца на некаторых прадпрыёмствах, а вытворчых нарад і камісій.

Кожнае прадпрыёмства, якое распачынае агляд, *павінна добра праверыць сваю падрыхтоўку да агляду.* У іншым выпадку агляд ня дасьць належных вынікаў.

Вялікую працу па падрыхтоўцы і правядзеньню агляду павінны правесьці рабкоры.

У нас на Беларусі з аглядам спазьніліся (кажуць, што перашкодзіла калдагаворная кампанія), але калі зараз энэргічна ўзяцца за справу, дык мы пасьпеем правесьці агляд з посьпехам.

Саюзы не падрыхтаваліся да агляду.

8-га студзеня г. г. у ЦСПСБ адбылася нарада ўпаўнаважаных ЦП прафсаюзаў па правядзеньню агляду вытворчых нарад і камісій.

З 10-ці вытворчых прафсаюзаў, якія павінны былі быць прадстаўлены на нарадзе, прысутнічала ўсяго 6 прадстаўнікоў. Характэрны той факт, што многія саюзы зусім і ня ведалі аб нарадзе, і многіх прыходзілася клікаць па тэлефону.

З інфармацыі, зробленай упаўнаважанымі, відаць, што амаль ніводзін саюз нічога не зрабіў дзеля правядзеньня агляду.

Напрыклад, друкары зусім нічога не зрабілі. У некаторых прафсаюзах нешта ўсё-ж зроблена. Швэйнікі, напрыклад, далі дырэктывы фабкомам другіх гарадоў. На фабрыцы «Меншвэй» падрыхтоўваецца да агляду рэдкалегія друкаванай фабрычнай газэты. Але аглядавай камісіі на фабрыцы няма.

Ня гледзячы на гэта, упаўнаважаны ўпэўнен у тым, што агляд па „Меншвае" пачнецца на гэтым тыдні.

Саюз Дрэваапрацоўчыкаў выдзеліў упаўнаважанага, які адначасова зьяўляецца сябрам прэзыдыуму саюзу і змушан разьяжджаць па райёнах па справе калдагаворнай кампаніі і ня мае магчымасьці зьвяртаць увагі на агляд.

Лепш стаіць справа ў саюзе папяровай прамысловасьці. На Дабрушскай фабрыцы праца па падрыхтоўцы агляду ўжо распачалася, але больш дробныя прадпрыёмствы нічога ня робяць. Упаўнаважаны саюзу папяровай прамысловасьці пераконаны ў тым, што яны пачнуць агляд 15-га студзеня і скончаць яго да 15-га лютага.

На некаторых прадпрыёмствах, як напрыклад на гарбарні «Бальшавік», ужо адбыліся сходы актыву, але далей праца пакуль што не пайшла.

На некаторых прадпрыёмствах харчавікоў («Пралетары») арганізаваны камісіі, але плану працы яшчэ няма.

Такім чынам, мы бачым, што ніводзін прафсаюз нічога па падрыхтоўцы агляду не зрабіў, ня гледзячы на тое, што падрыхтоўчая праца павінна ўжо была скончыцца да 1-га студзеня, а агляд да 1-га лютага. Нашы ўпаўнаважаныя спадзяюцца на тое, што «Правда» будзе праводзіць кампанію некалькі месяцаў, і яны яшчэ пасьпеюць папасьці ў «Праўду». Па думцы ўпаўнаважаных, галоўнай перашкодай у працы правядзеньня агляду, зьяўляецца тое, што ён (агляд) супаў з кампаніяй па перавыбарах саветаў і калдагаворнай кампаніяй, але некаторыя з іх прызналіся, што пры належным жаданьні працу магчыма было правесьці. У некаторых прафсаюзах (харчавікоў, напрыклад) зьяўляюцца тэнденцыі да правядзеньня агляду толькі буйных прадпрыёмстваў. Мы павінны яшчэ раз перасьцерагчы ад такіх крокаў. Аглядам павінны быць ахоплены **усе без выключэньня прадпрыёмствы.**

Парада ўхваліла наступную пастанову:

1. Прапанаваць усім ЦП саюзаў, якія яшчэ гэтага не зрабілі, выдзеліць упаўнаважаных.
2. ЦП саюзаў павінны даць дырэктывы акругам.
3. Усім фабкомам і завкомам арганізаваць аглядавыя камісіі.
4. Усё гэта павінна быць зроблена ў адзін тыдзень, каб праз 7 дзён сабралася зноў нарада ўпаўнаважаных па справаздачы аб зробленай за тыдзень працы.
5. Праз 10 дзён склікаць агульнагарадзкую нараду аглядавых камісій.
6. Сьцьвердзіць слабы ўдзел у аглядзе друку і прасіць яго прыняць больш актыўны ўдзел у гэтай спр.

С. Швэйдэль.

ПЯЦЬ ГОД БЯЗ ЛЕНІНА, АЛЕ ПАД СЬЦЯГАМ ЛЕНІНІЗМУ.

Пяць год мінула з таго часу, як першая ў сьвеце пралетарская рэвалюцыя, міжнародны пралетарыят і наша партыя страцілі вялікага правадыра.

Але што далей ідуць гады ад сумнага моманту ў гісторыі пралетарскай барацьбы, то яскравей выступае вялікая постаць правадыра, цудоўна вырысоўваецца геніяльная прадбачлівасьць яго гістарычных прагнозаў, вызначаючых на цалую эпоху сусьветнае развіцьцё.

Ленінізм—вострая і магутная зброя, накінутая правадыром Камінтэрну і нашай партыі. Зброя, якая з аднолькавым посьпехам дзейнічае і ў галіне арганізацыі сусьветнага пралетарыяту ў барацьбе за вызваленьне ад капіталістычнага прыгону, за сацыялізм, і ў сацыялістычным будаўніцтве ў краіне, дзе пралетарыят першым учыніў сваю рэвалюцыю.

Ленінізм дае магчымасьць Камінтэрну і нашай партыі ў вельмі складаных пераплётах сусьветных супярэчнасьцяй трымаць верны курс да перамогі сусьветнай рэвалюцыі. Загніваньне капіталізму, зьвязаны з гэтым загніваньнем сударгі новых войнаў, здольных квітнеючую зямлю абярнуць у могілкі руін і трупаў, іх намінучасьць вельмі правільна прадказана Леніным. І хіба-ж апошнія гады не даюць яскравых доказаў ленінскіх прадбачаньняў? Капіталістычны зьвер, амаль захлынаючыся ў крыві першай сусьветнай вайны, атрымаўшы глыбокую рану ад перамогі Кастрычніка на шостай частцы зямное кулі, мятусіцца, шукаючы выхаду з новых, яшчэ больш глыбокіх і вострых супярэчнасьцяй і ня бачыць іншага выхаду, як у новых патоках крыві.

Як сьнегавая лавіна нарастае канфлікт паміж капіталістычнымі волатамі — Злучанымі Штатамі Паўночнай Амэрыкі і Вялікабрытаніяй. Скачка ўзбраеньняў, шалёная мілітарысцкая прапаганда, першыя варніцы ваенных сутычак (Балівія—Парагвай), усё гэта гаворыць за тое, што Камінтэрн мецрацыю, зазначаўшы рабочым масам, на падставе ленінскіх прагнозаў, на будучую небясьпеку імпэрыялістычнай вайны.

І другі канфлікт, намінучасьць якога закладзена ў карэнных супярэчнасьцях двух сьветаў—сацыялістычнага і капіталістычнага, —небясьпека нападу імпэрыялістаў на СССР усё выразьней вырастае з кожным месяцам і годам.

Рашэньні Камінтэрну, зьвернутыя да масаў сусьветнай рабочай клясы, мірная палітыка савецкага ўраду зрываюць заслону таямніцы з ваеннай падрыхтоўкі імпэрыялістаў і іх прыслужнікаў сацыял-дэмакратаў. Асноўная задача перад тварам будучай небясьпекі, задача, настаўленая Леніным —падрыхтаваць да гэтай небясьпекі пралетарыят, не дапусьціць, каб імпэрыялісты зноў захапілі зьнянацку народныя масы і—«абярнуць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую». Гэты лёзунг Леніна на ўсю эпоху войнаў і рэвалюцый застаецца цэнтральным, вызначаючым палітыку Камінтэрну.

А чакуць гісторыя дае нам «перадышку»—усю энэргію мас у гэты першы перыяд кіраваць на будаўніцтва сацыялізму ў вешай краіне пралетарскай дыктатуры. Ніхто так ня быў упэўнен у гістарычнай магчымасьці—«абярнуць Расею нэпаўскую ў Расею сацыялістычную»—як Ленін. І якой грубай падтасоўкай, сапраўднай зьнявагай памяці правадыра гучала прапаганда трацкісцкай апазіцыі аб немагчымасьці пабудаваць сацыялізм у нашай краіне. Спасылацца на Леніна ў сваім агідным нявер'і ў творчыя сілы пралетарскай рэвалюцыі маглі толькі тыя, што адкаціліся ад Леніна, тыя, у якіх не хапала адвагі акрыта парваць з ленінізмам.

Узброеная ленінізмам, наша партыя ўсе гады без Ільліча здолела цьвёрдым крокам ісьці па вызначанаму іх шляху. Партыя адхіліла авантурызм трацкістаў, якія агітавалі за разрыў з асноўнымі масамі сялянства, бо толькі ў моцным саюзе з імі «ніякія сілы нас не перамогуць» (з прамовы Леніна на XI зьезьдзе партыі).

Партыя з ленінскай цьвёрдасьцю змагаецца і з тымі, хто ў спалоху перад цяжкасьцямі, хоча схіліць нас з шляху «ператварэньня Расеі нэпаўскай» у краіну сацыялізму. За пяць год бяз Леніна, але пад сьцягам ленінізму партыя няўхільна вядзе краіну па шляху індустрыялізацыі. Посьпехі на гэтым шляху, ня гледзячы на ўсе цяжкасьці, вялізныя. Мы падышлі да моманту, калі сацыялістычная прамысловасьць можа па-сапраўднаму выказаць сваю кіраўнічую ролю да надмерна адсталае сельскае гаспадаркі. Кіраўнічая роля сацыялістычнае прамысловасьці азначае перабудову дробнае сялянскае гаспадаркі на сацыялістычны лад. Мы падышлі шчыльна да гэтага моманту сацыялістычнае перабудовы вёскі. Яна ня можа быць «мірнай»—на яе шляху мы сустракаем суровы клясавы адпор кулацтва. І калі, напалоханыя гэтым адпорам крычаць партыі—ухіліся з гэтага шляху, ня крыўдзі кулака, бойся хлебных цяжкасьцяй—партыя адказвае рашучай барацьбой з правым ухілам ад ленінізму. Барацьба за цьвёрдую ленінскую лінію, барацьба за ленінскі сьцяг, узьняты над моцным саюзам рабочае клясы з серадняцкімі масамі, барацьба за кіраўнічую ролю ў гэтым саюзе пралетарыяту, за арганізацыю на вёсцы апорных батрацка-бядняцкіх цытадэляй,—гэта барацьба закладзена ў аснове сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

У пяць год бяз Леніна, але пад ленінскім сьцягам пройдзен слаўны шлях, дасягнуты агромадныя посьпехі ў „ператварэньні Расеі нэпаўскай у Расею сацыялістычную". Няўхільна расьце асноўная база сусьветнае пралетарскае рэвалюцыі, апора будучых сутычак рабочых мас з сусьветным капіталізмам.

І. П.

ПРАВОДЗІМ КОНКУРС

НА ЛЕПШУЮ СЭКЦЫЮ ГАРСАВЕТУ, НА ЛЕПШЫ СЕЛЬСКІ І МЕСТАЧКОВЫ САВЕТЫ З ІХ КАМІСІЯМІ.

Праз конкурс высьветлім лепшую пастаноўку практычнай працы сэкцый гарсаветаў, сельскіх і местачковых саветаў з іх камісіямі.

Сельсавет-кіраўнік грамадзкага жыцьця

(Лапіцкі сельсавет, Уваравіц. р., Гомельск. акр.).

Фактычна ўсю працу выконваюць амаль толькі старшыня і сакратар сельсавету. Што датычыцца сяброў сельсавету, дык за выключэньнем наведваньня пасяджэньняў, яны большавінная працы ня выконваюць; іх таксама даюць пэўныя заданьні, але яны іх выконваюць вельмі слаба.

Пры сельсавеце існуе 3 сэкцыі: сельска гаспадарчая, культурна-асьветная, і па ўпрацаваньню, але яны нічацна толькі на паперы, бо сябры сельсавету, якія выдзелены для кіраўніцтва сэкцыямі, нічога самі ня робяць. Усе пытаньні мясцовага значэньня не праходзяць міма савету, разглядаюцца на прэзыдыумах сельсавету і амаль што ўсе праводзяцца ў жыцьцё. Не праходзяць міма сельсавету і кампавейскія пытаньні. Сельсаветам распадзелены плян працы, які вывешваецца на відным месцы, і праца сельсавету праводзіцца па плану, наведваюць пасяджэньні сельсавету ня толькі сябры, але і актыў вёскі.

У чатырох школах працуе 6 настаўнікаў, школы забясьпечаны падручнікамі пакуль што на 70 проц. Дзеці школьнага ўзросту яшчэ ня ўсе ахоплены школай. Удзел у грамадзкай працы настаўнікі прымаюць, але яшчэ недастаткова. Праводзіцца некаторая культурна-асьветная праца.

У вёсцы Радзеева маецца хата-чытальня, а ў ёй розная літаратура. У зімовы час хата-чытальня працавала добра. Пры хаце-чытальні былі арганізаваны 3 гурткі: сельска-гаспадарчы, вытычны і драматычны. Таксама пры хаце-чытальні маюцца ячэйкі: ТДА-Авіяхіму, МОПРу, „Дзяч Нянісьменнасьць", але праца іх за летні перыяд зусім паслабла. Сельска-гаспадарчы гурток займаўся ня толькі тэаретычнай вучобай, сябры гурткa ажыцьцяўлялі свае веды на практыцы: удасконалілі хлявы, кармілі жывелу па нормах, сеялі радавой селькай і г. д.

Маецца добраахвотная пажарная дружына, а ў ёй машына, 3 очкі і калёны для перавозкі пажарных прыладаў.

Сельсаветам праведзена вялікая праца па каапэраваньню насельніцтва як у спажывецкую каапэрацыю, так і ў сельска-гаспадарчую каапэрацыю, сябрамі абедзьвюх каапэрацый зьяўляюцца каля 75 процантаў гаспадарак. Сельсаветам на вёсцы Радзеева і на сёлку Лапічы адчынены адзяленьні Уз'яднаньня спажывецкага таварыства і раённіцтва забясьпечана ўсімі неабходнымі таварамі. Акрамя гэтага, в эры ры сельсавету маецца малочны пункт і 3 мэліярацыйныя таварыства, з якіх працуе толькі Вы-сока Грыўскае. У гэту вясну ўзорана ўжо каля 10 дзесяцін сенажаці, і маецца плуг, барана і інш. У правядзеньні вясеньняй пасяўной кампаніі сельсавет прымаў актыўны ўдзел. Своечасова быў дастаўлен вобжажачышчальны абоз, узьнята хадайніцтва аб набыцьці яравога насеньня для сялян, а таксама і гатункова. Такім чынам было адгартавана шмат насеньня на пасеў, узята аўса „залаты дожж" 1.000 пуд., канюшыны 40 пуд. і каля 250 пуд. мінэральнага ўгнаеньня.

Таксама сельсаветам была праведзена праца ў адносінах пераходу на шматпольны севазварот. Сёлета вёска Радзеева, пасёлкі Лапічы і Чыстая Лужа перайшлі на 6-ціпольны севазварот. Сельсаветам арганізавана правесьці 6-ціпольны севазварот на пас. Завітаўка, Чырвонарэчча, Нікольск і інш. Праводзіцца праца і па правядзеньні асеньняе пасеўнае кампаніі ў сельсавеце.

Самаабкладаньне праведзена ў 6 насельніцкіх пунктах на суму ў 1376 р. 60 кап., з іх 413 р. заплачана грашыма і на 587 руб. 75 кап. адпрацавана; што тычыцца рэшты, дык яны ў бліжэйшы тэрмін будуць спагнаны і будуць выкарыстаны на іншыя патрэбы вёскі. На сродкі ад самаабкладаньня куплена 2 бычкі для ч. Радзеева і 1 для Каратковускае Слаболкі, пабудован мост, зроблен рамонт грэблі прыблизна каля 10 сажняў. Праводзіцца рамонт школ і г. д.

Таксама праводзіцца праца сярод жанчын. Працавалі 2 жаночыя делегацкія інстытуты, якімі ахоплена каля 70 жанчын. Дрэнна працав ў жаночы інстытут у Лапічах, за тым што ня было кіраўніка інстытуту. Маюцца практыкантці ў сельсавеце і камітэце ўзаемадапамогі, якія запрашаюцца на пасяджэньні. У вёсцы Радзеева працавалі дзіцячыя ясьлі, у якіх было каля 30 дзяцей. Сельсавет даволі зьвяртае увагі кіраўніцтву ўсімі арганізацыямі і ўстановамі, якія маюцца на яго тэрыторыі, шляхам заслухоўваньня іх дакладаў з папярэднім абсьледаваньнем на пасяджэньнях сельсавету.

Нарэшце трэба сказаць, што сельсавет хоць і працуе добра, але маюцца і некаторыя дэфэкты ў яго працы. Слабая праца сэкцый, недастаткова зьвяртаецца ўвага дабрабыту вёскі, не наладжана сталая сувязь з сялянствам і ня згуртован сялянскі актыў вакол сельсавету. Ад часу перавыбараў сельсавет не даваў справаздачы перад насельніцтвам, яшчэ не наладжана плянавасьць у працы сельсавету і іншыя недахопы.

М. Н. Драбышэўскі.

Без актыву працаваць цяжка.

(Майскі с.-с., Жлобінскага раёну, Бабруйшчына).

У параўнаньні з мінулымі гадамі праца сельсавету значна палепшылася; таксама трэба адзначыць, што склад сельсавету працаздольны, асабліва моцны прэзыдыум с.-с.

Пры складаньні аб'ектаў абкладаньня выяўлена зямлі 112,35 дз. і сенажаці 137,40 дз.

Па ўзьняцьцю ўраджайнасьці с.-с. прыкмаў шчыры ўдзел: ачышчана 1214 пуд. збожжа, што зьяўляецца, у параўнаньні з мінулымі гадамі, амаль што болей чым на 100 проц. Леташні год падняў дабрабыт вёскі, палепшыў становішча школ, настоў, пажарных дружын і г. д. Палепшаньне гэта прайшло за сродкі самаабкладаньня, якое было праведзена па с.-с. на 35 проц.

За сродкі самаабкладаньня зроблена наступнае: пабудавана школа ў вёсцы. Цяпер адрамантаваны тры школы. Пабудаваны два хлявы, адзін пры Антоўскай школе, другі—у Малых-Казловічах для пажарнай машыны. Набыт некаторы пажарны інвэнтар. Пабудавана 12 мастоў, па якіх раней нельга было ні прайсьці ні праехаць. Зроблена 8 бэтонных студняў, аб якіх раней сяляне і на думалі. Пабудован сьвіран у в. Дзяніскавічы для КСУ.

У гэтым навучальным годзе на с.-с. існуе адна школа для малапісьменных і адзін лікпункт, які ахапляе і дзяўчат.

Наогул с.-с. праведзена шмат працы, якая з кожным днём павялічваецца, бо с.-с. у сучасны момант узяў ся ва правядзеньне новага самаабкладаньня 1928-29 г. і ўжо праведзена ў в. Цупер на 20 проц., якое цалкам прызначана на школу.

Прэзыдыум с.-с. працаваў добра, а большасьць сяброў зусім ня цікавілася працай. Гэта зьяўляецца вялікім недахопам у працы с.-с., бо каб усе сябры дружна з ахвотай працавалі, а іх усіх маецца 17 чалавек, дык яшчэ больш было-б зроблена ў палепшаньні дабрабыту вёскі.

П. Слупскі.

КОНКУРСНЫЯ ЭКСПАНАТЫ.

(Як быццам фэльетон).

У нашых селькораў так многа працы, што дзіву дасься—як людзі вытрымліваюць. На верыце? Дальбог?

Сустрэне селькор Яцка селькора Сёмку, ды запыхаўшыся з «палынавай гарачкуў» перадае:

— Нічога, брат, ня выходзе... Быў у сельсавеце, — думаў ня конкурс у «Савецкую Беларусь» пісаць аб яго працы але ведаеш, нічога не падыходзе...

— Напрыклад?—запытвае Сёмка.

— Сакратар кажа, што нам нічого новага, усё звычайна, як у сотнях другіх сельсаветаў.

... Падумаеш калі - небудзь так і сапраўды шкада чалавеча стане. Добра было-б, каб гэта быў адзін чалавек, а то-ж... іх тысячы ў нашай Беларусі...

Сёньня мне, ня важна якім шляхам, удалося знайсьці адно месца, якраз падыходзячае да конкурсу, а па гэтаму, спачуваючы селькорам, рэбкорам і іншым „корам", сьпяшаюся праз прасу паведаміць аб гэтым «шчасьлівым» месцы. «Сродкі апраўдае мэта»—лемантарная ісьціна, а пагэтаму для «кораў» лёгчы шлях: сядайце на цягнік бліжэйшай станцыі і трымайце маршрут па адрасу:

— Вёска Салонае, Жлобінскі раён, Бабруйская акруга.

Вас сустрэне шэраг неспадзяванасьцей, але вы не зьвяртайце ўвагі—займіцеся сур'ёзным вывучэньнем працы Словінскага сельсавету.

Зайдзіце ў адну з хат болш падыходзячую да «бядняцкага тыпу» і дзядуля з белай, як сьнег на вуліцы, барадой—столькі дасьць вусім бясплатна матар'ялу, што вы сьпяшайцеся толькі запісваць.

Узяўшы матар'ял у дзядулі—пішэце на конкурс у «Савецкую Беларусь» прыблізна так:

«КУЛАЦКАЯ ХЭЎРА.

Старшыня сельсавету Мохараў абаранае кулакаў і свае радню. Сакратар сельсавету—сын буйнага гарадавога Абразцова. Старшыня, сакратар і рэвкамісія—сваты, браты, дзядзькі—адным словам—радня.

У часе вучоту аб'ектаў абкладаньня заможнікам шмат чаго незапісвалася, а беднае наадварот.

Пры будаўніцтве мастоў за сродкі самаабкладаньня працу атрымоўвалі заможнікі, а беднае...(дагадайцеся).

Хулганы, злодзеі і «іншыя» абараняліся «усёўладнай» рукой сельсавета баці.

А ў рэлігійныя сьвяты—шырокая хвала «горкай» разьлівалася ў хаце старшыні сельсавету. П'янствавау старшыня, п'янствавау сакратар, п'янствавала рэвкамісія сумесна з заможнікамі П'яны старшыня часта паўтараў:—Б-р-р-р... З-і-і-к-к... Я-я-я... з-за вас-с-с... Для весялосьці жартавалі з цацкамі сыстэмы «наган» і для весялосьці—«б-а-бах»... Палахлівыя «мужыкі» і «бабы» хаваліся па хатах. Камсамольцы казалі:—тэррор... белы тэррор»...

І апошнім «аккордам весялосьці» было складаньне пратаколу на нявінага селяніна за «бузацёрства, хуліганства і іншае»...

Калі хто небудзь з спрытных успамінаў аб самакрытыцы—зараз-жа складаўся пратакол, дзе яго «праступленьне» кваліфікавалася як «контррэвалюцыйнае»...

Прыблізна на гэтым і скончыце. А я сёўткі зноў спяшаюся заспакоіць, «кораў»—ня верце папярэднему... Нядзьдзе ў Салонае... Я напісаў памылкова. Гісторыя гэта скончылася: „атаманы" сельсавету з працы зьняты... і толькі... кажуць—справа ў пракуратуру перадзена... і толькі...

Ні я, ні вы, а ўсе разам—будзем патрабаваць наладжаньня ў хуткім часе паказальнага працэсу на месцы з належным пакараньнем «конкурсных экспанатаў"... і толькі...

Цім. Зарэчны.

Год барацьбы на культурным і гаспадарчым фронце.

(Круглянскі сельсавет, Аршанскай акругі).

Значнае месца ў працы сельсавету займае культурная праца. Па сельсавету існуе 7 школ, з якіх 1 сямігодка, усяго ахоп ена школамі 813 дзяцей і не ахоплена на розных прычынах 86 дзяцей. Нянісьменных па сельсавету 233 сярэдняга ўзросту. Але трэба сказаць пашчо, што нянісьменнасьць будзе ў большасьці ліквідавана. Зараз працуе 4 лікпункты. Але трэба адзначыць, што лікпункты ліквідуюць нянісьменнасьць аднаго чалавека некалькі год, ён сядзіць, не дае месца другому, зусім ня ісьменнаму. На тэрыторыі сельсавету існуе 3 чырвоных куткі, 1 пардом і 2 пясткавых хаты-чытальні.

Стрыжнем усяе працы стаіць гаспадарчая праца, бо гаспадарка ў сельсавеце ня вельмі добра разьвіта. Сельсавет мае 34 насяленых пункты, з якіх 10 землеўпарадкавана, 4 неземляўпарадкаваны і астатнія 20 знаходзяцца на хутарох.

На шматпольле пераведзена 4 вёскі з 190 гаспадаркамі, 15 пасёлкаў з 148 гаспадаркамі і 82 гаспадаркі індывідуальных. Калектыўныя гаспадаркі і аб'яднаньні займаюць нязначнае месца, усяго па сельсавету 10 калектыўных аб'яднаньняў, з якіх 4 мэліярацыйных т-вы, 1 сельска-гаспадарчая арцель, 1 машыннае т-ва, 2 садоваагародныя, 1 агнятрывалае і 1 шавецкая арцель. У зьвязку з гэтым трэба адзначыць, што калектыўныя аб'яднаньні працуюць вельмі квола, бо матар'яльна амаль не забясьпечаны, а таксама не здавальняюцца крэдытамі.

Да штучнага ўгнаеньня з боку насельніцтва мы маем вялікую зацікаўленасьць: усяго насельніцтвам разабрана 2018 пудоў штучнага ўгнаеньня і 400 пудоў зялёнага. Усяго па с.-с. засеяна канюшыны на 300 дзесяцінах. Здавальняючую колькасьць мае насельніцтва і машын, усяго 83 малатарні і 73 веялак, таксама маецца шмат іншых машын.

Зараз маецца 819 гаспадарак каапэраваных спажывецкай каапэрацыяй і 572 у сельска-гаспадарчай. Гаспадарак па сельсавету бяз коняй налічваецца 46 і без кароў 17. Лясы мясцовага значэньня займаюць 389 дзесяцін.

Значную дапамогу зрабіў сельсавет за гэты час бядняцкім гаспадаркам. Разьмеркавана бясплатна 23 гаспадаркам леса-матар'ялу на 780 рублёў і выдзелена ў крэдыт 27 гаспадаркам на 1050 рублёў. Купляй кароў забясьпечаны 18 гаспадарак і купляй коняй—35 гаспадарак, аслабанёна ад падатку 313 гаспадарак і часткова аслабанёна 62, што складае 34 процанты. Усяго падатку налічана было 24.406 р. 27 к., зьнята з бедняты 6.271 руб. 87 кап.

Існуючыя сэкцыі пры сельсавеце, акрамя культурнай і гаспадарчай, амаль не працуюць. Праца культурнай камісіі відаць: пры сельсавеце выпушчаецца насьценная газэта, якая асьвятляе адкуўныя і дадатныя бакі сельсавету і асобных яго працаўнікоў. Іншыя-ж сэкцыі, ня маючы адпаведных кіраўнікоў, сьпяць.

Пажарная справа абстаіць здавальняюча. На тэрыторыі сельсавету маюцца 5 пажарных дружын з 152 пажарнікамі. 4 пажарных дружыны забясьпечаны машынамі і пажарным інвэнтаром, таксама маецца 2 пажарных вані, купленыя за сродкі самаабкладаньня.

Самаабкладаньне палепшыла дабрабыт сельсавету. Усяго было сабрана—7574 рублёў, з якіх скарыстана—6073 руб. Зроблен рамонт у 4 школах, куплена 2 пажарныя машыны і пажарны конь. Абсталявана 2 пажарных дэпо. Для дружын зроблена 3 багорных хады, 40 тапароў і 10 багроў. Таксама абсталёван зубаўрачэбны габінэт, на які затрачана 1250 рублёў, але зараз гэты габінэт чамусьці зачынены. Урач, як быццам, паехаў у адпачынак, але і да гэтага часу яго няма. На што глядзіць наша мясцовая ўлада? Дзе РВК? Дзе лячэбніца? Сродкі, здаецца, траціліся не даромна, насельніцтва, адпушчаючы, меркавала атрымаць ад яго якую колеры дапамогу, альбо карысьць. Трэба бутзе паклапаціцца, каб габінэт зноў распачаў сваю працу.

Набудавана 13 мастаў і пачынена 4 грэблі. Для адной з школ пабудаваны хлеў. Таксама для інтэрнату пры Круглянскай сямёгодцы куплен дом Перавезен. Але бярвеньні пацiху адпачываюць пад адчыненым небам. Далей пабудова ні на крок уперад, ні на крок назад. Для бяднейшых вучняў аказана дапамога як матар'яльна, так і эканамічна, усяго затрачана 300 рублёў.

Камітэт узаемадапамогі мае фонду: 600 пудоў насеньня і 260 рублёў грошай, якія сабраны па сяброўскіх узносах. Камітэтам засеены 4 дзесяціны жытам і 2 дзесяціны аўсом. Трэба заўважыць па безгаспадарчасьць камітэту. Маючаяся малатарня паланана, а таксама машыны ў першую чаргу скарыстоўвае для свае гаспадаркі старшыня камітэту.

Перавыбары сельсавету ўжо пачаліся. Галоўную ўвагу ўсяму насельніцтву трэба будзе завастраць на пытаньне выбараў якаснага складу сельсавету, бо гэтая якасьць зараз адсутнічае. Сельсавет мае многа непрацаздольных таварышоў, якія займаюцца толькі галаванцтвам. Сябра сельсавету Дасюля Цімох, у час ходу кампаніі па вучоту аб'ектаў абкладаньня, прымае актыўны ўдзел у вахаваньні жывёлы ў сваёй гаспадарцы. Ён скача над дудку заможнікаў—дае кулакам і іншым няправільныя даведкі. Далей т. т. Мяцеліца Хведар і Зяньковіч П. ня ведаюць сваіх абавязкаў: сход склікаць--гэта ня іх справа, сябра Сазановіч Данілa замест таго, каб весьці барацьбу з самагонакурэньнем, яшчэ больш яе распаўсюджвае і гоне яе сам. Брыгневіч К. больш клапоціцца аб сабе, аб сваёй гаспадарцы, чым аб беднаце. Калі праходзіла разьмеркаваньне сенажаці, ён сябе не забывае, а беднята застаецца без сенажаці.

Вось элементы, якія ў бягучым годзе пры перавыбарах у сельсаветы не павінны ўвайсьці у с.-с., бо яны тармозяць і калечаць працу нашага сельсавету.

Міхась.

НА ЧАРГОВЫ ЭТАП.

Першая частка перавыбарчае кампаніі ў саветы закончана; па ўсіх сельскіх і местачковых саветах ужо адбыліся справа дачныя сходы. Мы пераходзім на новы этап, на важнейшы вучастак гэтае кампаніі, менавіта, на выбарчыя сходы.

Ужо зараз можна спыніцца на папярэдніх вынніках падрыхтоўчае работы да кампаніі і на самых справаздачных сходах. Як на агульнае зьявішча трэба ўказаць, што ў большасьці там, дзе была своечасова распачата падрыхтоўка, там, дзе партыйныя ячэйкі і сельскія саветы ў час разгарнулі кампанію, арганізавалі беднату, растлумачылі вясковай беднаце задачы кампаніі, падрыхтавалі да ўдзелу ў справаздачах усе вясковыя арганізацыі (каапэрацыя, КСТУ, недыцыцкія пункты, арганамію),—так справаздачныя сходы прайшлі актыўна, пры дастатковым ліку прысутных.

Болей таго, актыўнасьць прысутнай бедноты была накіравана на раскрыцьцё працы дрэннага сельсавету, які не абараняў інтарэсаў бедноты, актыўнасьць была накіравана на абарону клясава-вытрыманага сельсавету ад кулацкіх нападаў. Усё гэта наглядалася, паўтараю, менавіта пры дастатковай арганізацыйнай пастаноўцы гэтае кампаніі на мясцох.

Вышэйпаказаную думку можна ілюстраваць цалым шэрагам фактаў. Вось некаторыя з іх:

У адным з раёнаў Магілеўскай акругі сяляне аб справаздачных сходах наведамляліся толькі за паўгадзіны да сходу. У выніку—прысутных было ня болей 30-32 проц. ад усяго ліку выбаршчыкаў. Яшчэ больш сумныя факты наглядаліся ў Полаччыне. У Сястрынскім сельсавеце зусім дрэнна абстаяла справа. Ёсьць выбарчыя вучасткі, якія ахопліваюць 24 насельных пункты з лікам да 588 выбаршчыкаў. Тут простае парушэньне законаў ураду і дырэктыў партыі. Акрамя таго, некаторыя ўпаўнаважаныя позьна сходы посьпь у кішэні, сяляне аб сходах не наведамляліся.

Такія вёскі, як Грашанята, Мастаўха, Старана зусім не ахоплены справаздачнымі сходамі. Вынікам гэтага зьяўляецца тое, што на шмат якіх справаздачных пунктах яўка выбаршчыкаў дасягала толькі 20,6 проц. (Чашскі пункт) і 29 проц. (Лютаўскі пункт). Гэта ўсё з тае прычыны, што работа праводзілася васьпех, у 2-3 дні. Падрыхтоўку вёў толькі старшыня сельсавету.

У тым-жа Полацкім раёне, у Бельскім сельсавеце, сяляне самі хадзілі і шукалі для сходу памяшканьня, бо той будынак, які для сходу намеціў сельсавет, быў халодны, з набітымі вокнамі. Аб часе сходу ніхто ня ведаў. Таму замест 200 выбаршчыкаў прысутнічала толькі 42 і тыя хутка разыйшліся, падзякаваўшы як належыць сельсаветчыкам за дрэнную падрыхтоўку.

Але досыць пра няўдалую падрыхтоўку кампаніі некаторымі сельсаветамі.

Што зрабілі іншыя арганізацыі па вёсцы?

Возьмем хаты-чытальні.

Азарынка-Слабадская хата-чытальня (Меншчына), напрыклад, не правяла ніводнага дакладу, ніводнай гутаркі аб значэньні перавыбараў саветаў. Літаратура, атрыманая па гэтым пытаньні ад шэфаў ужо пасьпела запыліцца, ляжучы на шафе; да яе ніхто і не дакрануўся. Чым быў заняты загадчык хаты-чытальні, што рабіў сельсавет—невядома, а вось па прысутнасьці выбаршчыкаў на сходзе гэта адбілася: 25 процантаў яўкі ў вёсцы Дынароўка, 34,4 проц. яўкі ў вёсцы Вялікае Залужжа.

Мы можам быць задаволены толькі тым, што такіх прыкладаў наглядаецца ня шмат. Гэтыя прыклады зьяўляюцца ня масавымі, адзінкавымі, нібы шчэпы ад стройных рыштаваньняў сусьпільнае своечасова наладжанае кампаніі.

У гэтым годзе трэба сказаць, на падставе папярэдніх матар'ялаў, што арганізацыйная кампанія па перавыбарах саветаў наладжана куды лепш, чым у мінулыя гады. Своечасовыя дырэктывы ўраду і партыі далі належны напрамак кампаніі.

Павялічан лік справаздачных і выбарчых вучасткаў, вылучаны нацыянальныя меншасьці для асобных сходаў. Амаль што ўсюды праводзіліся папярэднія сходы беднаты і батрацтва. Больш - менш стала падрыхтаваны справаздачы з удзелам каапэрацыі, агранаміі, якія задавальняюць выбаршчыкаў.

Аднак і ў арганізацыйных пытаньнях па некаторых сельсаветах ёсьць значныя недахопы. Так, у Лагойскім раёне (Меншчына) зусім няправільна падышлі да складаньня сьпісаў пазбаўленых права голасу. Па Кузяўскаму сельсавету на адным з выбарчых пунктаў знаходзіцца 200 жанчын, маючых права голасу, а ў сьпісы абіральнікаў унесена толькі 24 (!?). Пры складаньні сьпісаў выбаршчыкаў не запісвалі старэйшых жанчын. А побач, Янушкаўскі сельсавет ня згодзен, напрыклад, пазбавіць права голасу аднаго спэкулянта - гандляра. Некаторыя-ж сельсаветы надумалі інакш:

— Ня варта турбавацца.

Перапісалі леташні сьпіс і без разгляду пераслалі ў раённую выбарчую камісію.

А клясавы вораг між тым прымае ўсе меры да таго, каб захапіць саветы ў свае рукі.

Прыкмечна тут наглядаецца таксама своечасовасьць блёк. „Быўшыя" людзі як далёкія (жандары, паліцэйскія) так і нядаўнія (выкінутыя з сав. установаў за растраты, вахлакіцтва, злоўжываньні) аб'яднаюцца разам з кулаком. Розными хітрыкамі падманваюць таго-сяго з бядняцтва ці серадняцтва і самі хаваюцца за іх плячыма. Адкрытыя-ж выступленьні ў самым пачатку былі разьбіты беднатой. Даецца адпор і скрытым выступленьням.

На справаздачных сходах ужо яскрава выявілася гэтая барацьба.

Робіць справаздачу сельсавет—чые інтарэсы абараняў ён?—пытаецца беднота. Калі сельсавет вёў пралетарскую лінію, калі сельсавет стаяў на варце інтарэсаў бедняка, калі сельсавет быў працаздольны,—беднота ў сваіх выступленьнях, ухваляючы правільную яго (сельсавету) лінію, адзначала асобныя пропускі ў працы і ўносіла шэраг новых карысных прапаноў. Разглядаліся пытаньні каапэраваньня, землеўпарадкаваньня, калектывізацыі правядзеньня пасеўных кампаній.

У адваротным выпадку працу сельсавету бязьлітасна «крылі». Кулацкая частка вёскі тады ў сваіх выступленьнях абараняла такі непралетарскі сельсавет. Спрэчкі пераходзілі ад адзінкі працы сельсавету да важных палітычных пытаньняў і кампаній (загатоўкі, самаабкладаньне, падатак).

У Букчанскім сельсавеце, Мазырскай акругі, калі заможнікі пачалі пасвойму «крыць» сельсавет, дык адзін з выступаўшых беднякоў даў характэрны адказ.

— Калі-б заможнікі і кулакі хвалілі наш сельсавет, грош бы цана яму была-б.

Тут наглядаецца простая, правільная ўстаноўка беднаты.

Можна прывесьці шмат прыкладаў абвастраньня клясавае барацьбы на вёсцы. Беднота ўсюды дае рашучы адпор кулацкім выбрыкам і сама пераходзіць у наступ. Прычым беднота не адзінока. На ўсіх сходах разам з беднатою выступае і большасьць вёскі—серадняцтва. Саюз беднаты і серадняцтва ў часе справаздачнае кампаніі ўзмацніўся, набыў канкрэтную форму.

Ужо пачаліся перавыбарчыя сходы. Першыя весткі паказваюць, што бядняцка-серадняцкі блёк яшчэ болей замацоўваецца. Трэба ўлічыць вопыт справаздачнае кампаніі, выправіць усе арганізацыйныя недахопы. Трэба, як належыць, падрыхтоўваць памяшканьні, своечасова наведамляць выбаршчыкаў аб сходах.

Вопыт выезду рабочых дэлегацый у вёскі на перавыбары даў добрыя вынікі. Трэба яшчэ болей пашырыць выезды рабочых брыгад. Тады агульным пралетарскім фронтам батрацтва і беднота, разам з сераднякамі, выбяро свае клясава вытрыманыя, працаздольныя саветы.

Васіль Золкі.

У Савеце Народных Камісараў БССР.

Э-га студзеня г. г. адбылося чарговае пасяджэньне СНК пад старшынствам тав. Галадзеда, М. М. На гэтым пасяджэньні разам з іншымі было разгледжана пытаньне

аб хімізацыі народнай гаспадаркі БССР.

Вялізарныя посьпехі сучаснай хіміі высоўваюць задачу хімізацыі, г. з. перабудову ўсіх галін народнай гаспадаркі на аснове навейшых дасягненьняў хімічнай техніці, як адзінага з найбольш сапраўдных сродкаў для сацыялістычнай перабудовы і індустрыялізацыі народнай гаспадаркі. У БССР хімічная прамысловасьць пакуль што разьвіта слаба і займае ва ўсёй прамысловасьці, апроч запалкавай прамысловасьці, 0,8 проц. Але ў бліжэйшыя гады гэта галіна прамысловасьці павінна значна пашырыцца і ў 5-цігадовым плане разьвіцьця народнай гаспадаркі БССР ужо прадугледжан цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія накіраваны на хімізацыю ўсёй народнай гаспадаркі БССР. Гэтыя мерапрыёмствы значна павялічваюць сыравую і энергетычную базу для нашай прамысловасьці і ўводзяць цэлы шэраг выгодных да гэтага часу адкідаў і могуць на працягу 5-цігодзьдзя даць значныя станоўчыя вынікі.

Па пяцігодны ўдзельная вага хімічнай прамысловасьці на ўсёй прамысловасьці БССР павялічваецца да канца пяцігодзьдзя з 0,8 проц. да 5.1 проц., валавая прадукцыя павялічваецца на 452 проц., лік рабочых хімічнай прамысловасьці, апроч шкіпной, павялічваецца з 3.442 да 7.575.

Па пасобных галінах хімізацыя народнай гаспадаркі БССР павінна найсьці ў такім напрамку: у сельскай гаспадарцы—унядраньне штучных угнаеньняў і хімічная апрацоўка насеньня, выпрацоўка найбольш даступных сродкаў змаганьня са шкодзікамі, хімічная перапрацоўка сельска-гаспадарчых прадуктаў і леса-хімічная прамысловасьці—індустрыялізацыя гэтай прамысловасьці і поўная яе рэканструкцыя, пашырэньне і планамернае ўвядзеньне падсочнай гаспадаркі з мэтаю дабычы шпігінару і каніфолі, выпрацоўка дубільных экстрактаў і г.д. У галіне хімічнай перапрацоўкі торфу намечана газафікацыя торфу для атрыманьня газа, перапрацоўкі торфу ў сьпірт, ужываньне торфу на ўгнаеньне і г. д. Па новай хімічнай прамысловасьці намечена максымальнае развіцьцё прамысловасьці штучнага валакна, якое пав нна зьявіцца базай для разьвіцьця ў БССР чулочна-трыкатажнай тэкстыльнай прамысловасьці, арганізацыя электрахімічнай прамысловасьці (гідрастанцыя на Кабылянскіх парогах, гідраўстаноўкі ў басэйне р. Бярэзіны пры гідратэхнічных работах).

Бяручы пад увагу неабходнасьць узмацненьня хімічных працэсаў у народнай гаспадарцы БССР, СНК прыняў неабходным арганізаваць пры СНК камітэт па хімізацыі народнай гаспадаркі БССР пад старшынствам Намесьніка Старшыні СНК т. Каркліна М. М. Намесьнікаў яго т. т. Сасноўскага (Нам. Нар. Кам. Земляробства) і Берсукова (Нар. Кам. Ах. Здароўя). Членамі прэзыдыуму камітэту па хімізацыі зацьверджаны: Прыляжаеў (праф. БДУ), Яндульскі (Старшыня ЦК саюзу хэмікаў), Натансон (Інжынэр-хэмік Дзяржпляну), Гарэцкі (Дырэктар Нав.-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна) і Саўкін (хэмік Менскай Балотнай станцыі). Зацьвердзжана таксама плянарны склад камітэту ў ліку 35 чалавек з прадстаўнікоў інжынэрна-тэхнічных сэкцый прафарганізацый, пасобных вучоных і спэцыялістаў, навуковых працаўнікоў вышэйшых школ і інш.

На камітэт па хімізацыі ўскладзена распрацоўка асноўных дырэктыў па хімізацыі народнай гаспадаркі БССР і агульнае кіраваньне працаю апавядных органаў у галіне хімізацыі. На Дзяржплян усклазена, пры ўдзеле камітэту, распрацоўка пляну хімізацыі распублікі, які павінен увайсьці асобным разьвелам у перспэктыўны плян разьвіцьця народнай гаспадаркі.

ВСНГ даручана прадугледзіць максымальнае ўмацаваньне тэмпу хімічнай прамысловасьці і ў першую чаргу заводаў па хімічнай перапрацоўцы торфу, драўніны і інш., а таксама прыняць меры да пашырэньня як цэнтральнай лябараторыі ВСНГ, так і сеткі хімічных лябараторый на заводах. Прызнана неабходным пашырыць і ўзмацніць існуючую сетку навукова-дасьледчых устаноў БССР і арганізаваць пры іх, а таксама пры вышэйшых школах спэцыяльныя навукова-дасьледчыя катэдры па хіміі, скарыстоўваючы іх для патрэб хімізацыі народнай гаспадаркі рэспублікі.

Адной з асабліва важных задач зьяўляецца сыстэматычная падрыхтоўка камітэхнічных навуковых працаўнікоў Бярэчы гэта пад увагу СНК даручаў НК Асьветы разам з камітэтам па хімізацыі прыняць меры да таго, каб пры БДУ б'ў хутчэй арганізаваны Хэміка-Тэхнічны Факультэт, а таксама распрацаваць пытаньне аб узмацненьні сыстэмы аспірантуры пры вышэйшых школах і навуковых установах БССР у галіне хіміі. Для ўзмацненьня сувязі навуковых прамысловых арганізацый з сучаснай тэхнікай, камітэту па хімізацыі даручана прыняць меры да павялічэньня камандыровак у навуковыя цэнтры СССР і заграніцу вучоных інжынэраў і кіраўнікоў хімічнай гаспадаркі, а таксама распрацаваць методы скарыстаньня камандыровак вучоных, інжынэраў і кіраўнікоў іншых галін гаспадаркі ў справе ўзмацненьня хімізацыі БССР.

ВСНГ, камітэту па хімізацыі, НК Працы і ЦК Асьветы запрапанавана прыняць тэрміновыя меры да ўпарадкаваньня існуючай сыстэмы практыкантства і стажорства студэнтаў-хімікаў і прыняць меры да максымальнага пашырэньня навукова-хімічнай падрыхтоўкі вучняў па ўсёй сетцы народнай асьветы. Камітэту па хімізацыі даручана прыняць меры да палепшаньня хіміка-тэхнічных аддзелаў сяльскіх бібліятэк і палегчаньня індывідуальнай выпіскі спэцыяльнай замежнай літаратуры.

Адсталых трэба падцягнуць.

Праглядаючы вынікі працы па ліквідацыі нянісьменнасьці за мінулыя гады, трэба адзначыць, што тэмп гэтае працы быў зусім недастатковы. Гэтым пытаньнем займаліся на мясцох зусім мала, аб прыцягненьні грамадзкасьці да гэтае справы мала хто клапаціўся. Вызначаныя па мясцовому каштарысу сродкі на ліквідацыю нянісьменнасьці скарыстоўваліся на іншыя патрэбы, або зусім заставаліся нескарыстанымі. Такое зьявішча сьведчыць аб тым, што кіруючыя асьветай раённыя працаўнікі мала цікавіліся справай ліквідацыі нянісьменнасьці. У выніку—слабая падрыхтоўка працаўнікоў у лікпунктах, недастатковае забясьпечаньне падручнікамі і пісьмовымі прыладамі, несваечасовае адчыненьне лікпунктаў і няпоўнае ўкамплектаваньне вучнямі, адсутнасьць вучоту наведваючых лікпункты і вопыту працы ў гэтай галіне.

Недахоп у прыладах і падручніках

Не застанаўліваючыся на недахопах падручнікаў в боку іх дапасаванасьці да працы, трэба адзначыць, што на мясцох адчуваўся колькасны недахоп іх, несваечасовае забясьпечаньне імі ў мінулым годзе і ў гэтым годзе, што не давала магчымасьці райёнам своечасова пачаць працу на лікпунктах.

Саўгасы і калгасы не абслугоўваюцца лікпунктамі.

У саўгасах і калгасах, гэтых сацыялістычных адзінках нашай краіны, ліквідацыя нянісьменнасьці ў мінулыя гады амаль што не праводзілася. У сёлетнім навучальным годзе, ня гледзячы на дадзеныя ўказаньні па лініі Белкалгассаюзу, НКА і Т-ва «ПН» аб правядзеньні ліквідацыі нянісьменнасьці ў ударным парадку, па абсьледваньню Магілеўскай акругі выяўлена, што праца там зусім не праводзіцца ў калгасах. Па адным з калгасаў Магілеўшчыны, дзе з 17 жанчын усяго адна пісьменная, а таксама маюцца і нянісьменныя мужчыны, — ніхто не паклапаціўся задаволіць яго лікпунктам.

Прафарганізацыі шкадуюць сродкі

Плянавасьці ў працы прафсаюзаў па галіне ліквідацыі нянісьменнасьці няма, яны праводзяць яе, як каму ўздумаецца, пры адсутнасьці канкрэтных указаньняў з боку ЦСПСБ. А ЦСПСБ, складаючы свае пляны па ліквідацыі нянісьменнасьці, вельмі баіцца патрацiць вялікі процант культфонду на ліквідацыю нянісьменнасьці, спад

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра рацыяналізацыю падліку і справаздачнасьці дзяржаўных устаноў і прадпрыёмстваў, каапэрацыйных арганізацый і акцыйных таварыстваў з удзелам дзяржаўнага і каапэрацыйнага капіталу.

У дапаўненьне да пастановы Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 30 красавіка 1927 году «пра парадак пазьненьня справаздачнасьці дзяржаўнымі органамі, каапэрацыйнымі арганізацыямі і акцыйнымі таварыствамі з удзелам дзяржаўнага і каапэрацыйнага капіталу» (З. З. СССР 1927 г., № 26, арт. 278) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць устанавіць наступны парадак падліку справаздачнасьці дзяржаўных устаноў і прадпрыёмстваў, каапэрацыйных арганізацый і акцыйных таварыстваў з удзелам дзяржаўнага і каапэрацыйнага капіталу:

I. УСТАНАЎЛЕНЬНЕ СПРАВАЗДАЧНАСЬЦІ.

1. Народныя камісарыяты і іншыя цэнтральныя ўстановы БССР, а таксама цэнтральныя каапэрацыйныя арганізацыі пры ўстаноўленьні парадку пачатковага падліку, а таксама пастаянай, абёму, форм і тэрмінаў справаздачнасьці павінны дакладна разьмяркоўвань справаздачнасьць, детычную, з аднаго боку, да апэраціўнай працы самой установы, з другога боку—да працы дзяржаўнае статыстыкі. Вызначаючы аб'ёкты падліку, яны павінны ўзгадняць свае патрэбы з патрэбамі зацікаўленых у гэтым устаноў і арганізацый.

2 Сыстэма падліку і справаздачнасьці ўстанаўлецца належным ведамствам альбо арганізацыяй з удзелам зацікаўленых устаноў і статысты пасьлянае камісіі Цэнтральнага Статыстычнага Кіраўніцтва і акцыяцыўяюцца па ўзгадненьні з ЦК РСІ БССР.

Увага: Сукарэчаньні паміж ведамствамі альбо арганізацыямі ў справе пачатковага падліку і справаздачнасьці вырашаюцца ЦК РСІ.

3. Пасобныя пытаньні справаздачнасьці выходнога характару, якія не прадугледжаны сыстэмаю ведамсьцьвенае справаздачнасьні, могуць дапушчацца ў выключных выпадках з дазволу адпаведнага наркісара альбо кіраўніка цэнтральнага ведамства ці арганізацыі, толькі пры мажлівасьці дачы такіх зьвестак на падставе даных пачатковага падліку, причым такія ня патрабаваньні запісваюцца ў табель справаздачнасьці.

II. ПАРАДАК ПАДАНЬНЯ СПРАВАЗДАЧНАСЬЦІ.

4. Парадак паданьня справаздачнасьці ўстанаўлецца табелямі справаздачнасьці, якія складаюцца паводле артыкулу 2 гэтае пастановы.

5. Табэль справаздачнасьці кожнага ведамства альбо арганізацыі павінен зьмяшчаць у сябе наступныя даныя: а) прадмет справаздачнасьці, б) хто складае справаздачнасьць, в) за які перыяд часу, г) каму падаецца справаздачнасьць, д) на які дзень месяца яна вызначана, е) в якіх матар'ялах складаецца справаздачнасьць, ж) подстава даданьня справаздачнасьці, з) увага.

Да табелі даданецца адпаведная інструкцыя аб парадку складаньня справаздачнасьці.

Запатрабаваньні абъединаных народных камісарыятаў альбо агульнасаюзных цэнтральных устаноў і арганізацый уключаюцца ў агульны табель справаздачнасьці адпаведнага ведамства альбо арганізацыі БССР.

III. ПАРАДАК ЗЬМЕНЫ АСНОЎ ПАЧАТКОВАГА ПАДЛІКУ, А ТАКСАМА СПРАВАЗДАЧНАСЬЦІ.

7. Усе зьмены асноў пачатковага падліку, а таксама справаздачнасьці павінны рабіцца на падставе перадавых практыкі і новых задач, якія стаюць перад дзяржавай, не пазьней як за два месяцы да ажыцьцяўленьня паказаных мерапрыёмстваў, паводле арт. 2-5 гэтае пастановы.

IV. ПАРАДАК АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ГЭТАЕ ПАСТАНОВЫ.

8. Парадак ажыцьцяўленьня гэтае пастановы ўказваецца на Народны Камісарыят Рабоча-Селянскае Інспекцыі, які вядзе агульнае кіраўнічае нагляд і кантроль, а таксама устанаўлае па ўзгадненьні з адпаведнымі ведамствамі паступаючы ад устаноўленага парадку справаздачнасьці.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

5 студзеня 1929 г. г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о рационализации учета и отчетности государственных учреждений и предприятий, кооперативных организаций и акционерных товариществ с участием государственного и кооперативного капитала.

В дополнение к постановлению Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 30 апреля 1927 года „о порядке представления отчетности государственными органами, кооперативными организациями и акционерными обществами с участием государственного и кооперативного капитала“ (С. З. СССР 1927 г. № 26, ст. 278) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют установить следующий порядок учета и отчетности государственных учреждений и предприятий, кооперативных организаций и акционерных обществ с участием государственного и кооперативного капитала.

I. УСТАНОВЛЕНИЕ ОТЧЕТНОСТИ.

1. Народные комиссариаты и другие центральные учреждения, а также центральные кооперативные организации при установлении порядка первичного учета, а также изменений, объема, форм и сроков отчетности должны соответственно распределять отчетность, относящуюся с одной стороны, к оперативной работе самого учреждения, с другой стороны—к работе государственной статистики. Установляя объекты учета, они должны согласовывать свои нужды с нуждами заинтересованных в этом учреждений и организаций.

2 Система учета и отчетности устанавливается соответствующим ведомством или организацией с участием заинтересованных учреждений и статистической плановой комиссии Центрального Статистического Управления и осуществляется по согласовании с Народным Комиссариатом Рабоче-Крестьянской Инспекции БССР.

Примечание. Противоречия между ведомствами или организациями в деле первичного учета и отчетности разрешаются Народным Комиссариатом Рабоче-Крестьянской Инспекции.

3. Отдельные вопросы отчетности случайного характера, не предусмотренные системою ведомственной отчетности, могут допускаться в исключительных случаях с разрешения соответствующего народного комиссара или управляющего центрального ведомства, или организации только при возможности дачи таких сведений на основании данных первичного учета, причем такие требования заносятся в табель отчетности.

II. ПОРЯДОК ПРЕДСТАВЛЕНИЯ ОТЧЕТНОСТИ.

4. Порядок представления отчетности устанавливается табелями отчетности, составляемыми на основании статьи 2 настоящего постановления.

5. Табели отчетности каждого ведомства или организации должны заключать в себе следующие данные:

а) предмет отчетности, б) кто составляет отчетность, в) за какой период времени, г) кому представляется отчетность, д) на какой день и месяц она представляется, е) на каких материалах составляется отчетность, ж) основание представления отчетности, з) примечание.

К табели прилагается соответствующая инструкция о порядке составления отчетности.

Требования объединенных народных комиссариатов или общесоюзных центральных учреждений и организаций включаются в общую табель отчетности соответствующего ведомства или организации БССР.

III. ПОРЯДОК ИЗМЕНЕНИЯ ОСНОВ ПЕРВИЧНОГО УЧЕТА, А ТАКЖЕ ОТЧЕТНОСТИ

7. Все изменения первичного учета, а также отчетности должны делаться на основании превварительной практики и новых задач, стоящих перед государством, не позже как за два месяца до осуществления указанных мероприятий, на основании статей 2-5 настоящего постановления.

IV. ПОРЯДОК ОСУЩЕСТВЛЕНИЯ НАСТОЯЩЕГО ПОСТАНОВЛЕНИЯ.

8. Порядок осуществления настоящего постановления возлагается на Народный Комиссариат Рабоче-Крестьянской Инспекции, который проводит общее руководство, наблюдение и контроль, а также устанавливает по согласовании с соответствующими ведомствами отступления от установленного порядка отчетности.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

5 января 1929 г. г. Минск.

АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ МАНІФЭСТУ ЮБІЛЕЙНАЙ СЭСІІ ЦВК БССР.

Учора адбылося першае пасяджэньне Менскай акруговай камісіі па ажыцьцяўленьні амністыі, абвешчанай маніфэстам Юбілейнай Сэсіі ЦВК БССР.

Камісія разгледзела 57 спраў асуджаных на тэрмін ад 1 да 3 месяцаў і пастанавіла вызваліць 45 чал.

Сёньня а 9 й гадзіне раніцы яны будуць вызвалены.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да Ўсебеларускай Выстаўкі Сельскай Гаспадаркі і Прамысловасьці.

10-га студзеня пад старшынствам т. Галадзеда адбылося пасяджэньне Выставачнага Камітэту па падрыхтоўцы да Усебеларускай Выстаўкі Сельскай Гаспадаркі і Прамысловасьці. На пасяджэньні вырашан цэлы тэраг пытаньняў зьвязаных з пабудовай памяшканняў для выстаўкі. Пастаноўлена у гэтым сэзоне распачаць будаўніцтва памяшканьні для выстаўкі будуць будавацца ў саўгасе В. Сляпянка. Будзе пабудавана 12 павільёнаў; пабудова ўсіх павільёнаў абыйдзецца 700 тысяч рублёў. Будаўніцтва павінна быць закончана да жніўня 1930 году.

Пастаноўлена, каб Нар. Кам. Зем узбудзіў хадайніцтва перад гарсаветам аб правядзеньні да месца выстаўкі трамвайнай каляіны і вадаправоду

У той жа дзень адбылося пасяджэньне Дырэкцыі Выставачнага Камітэту. На гэтым пасяджэньні былі вызначаны загадчыкі ўсіх аддзелаў выстаўкі. Навукова-дасьледчым аддзелам—т. Бойка, земляробчым—праф. Скандракоў, жывёлаводчым—праф. Найдзёнаў, лясной гаспадаркі—праф. Мельнік, мэліярацыі—праф. Дубах, землеўпарадкаваньня і сельска-гаспадарчага будаўніцтва—т. Някрасаў, абагуленага сэктару—т. Ануфрыеў, мэханізацыі і электрыфікацыі—проф. Вэйс, рыбнай гаспадарыі—т. Тарасаў, хатняй гаспадаркі—т. Мялешка, прамысловасьці—т. Стракоўскі, Аддзелу экспарту і імпарту—т. Абрамсон.

Пастаноўлена ўзбудзіць хадайніцтва перад Нар. Кам шляхавых зносін аб правядзеньні да месца пабудовы выстаўкі вузкай каляіны і аб пабудове паўстанку на час выстаўкі.

Дзе будзе пабудавана 2-я раённая электрастанцыя.

СНК БССР пастанавіў прыступіць у працягу 5-цігодзьдзя да пабудовы ў БССР 2-й раённай электрастанцыі. Сэсія ЦВК БССР гэтую пастанову зацьвердзіла.

9-га студзеня г. г. пры ВСНГ адбылася нарада спэцыялістаў-прадстаўнікаў Дзяржпляну, ВСНГ, Акадэміі Навук, НК Земляробства, Белторфу, Дзяржаўнага Электра-Трэсту і інш.

Нарада разглядзела два пункты, дзе можа быць пабудавана электрастанцыя.

Першы—у раёне гор. Гомелю на Кабылянскім тарфяным масыве. Масыў займае плошчу ў 6500 гэктараў. Праз яго праходзяць чыгунка і шаса. Сярэдняя глыбіня залягання торфу—2 мэтры, максымальная—8 мэтраў Масыў мае запас торфу (сухога) каля 6 міліёнаў кубічных сажняў.

Другі—на Судобльскім тарфяным масыве ў 5 кілёмэтрах ад ст. Жоозіна (Меншчына.)

Гэты масыў займае плошчу ў 12 тысяч гэктараў і мае запас торфу для электрастанцыі на 300 год. Прычым, на Судобльскім балоце торф лепшай якасьці (менш попелу), але здабываньне яго цяжэйшае, чымся на Кабылянскім, бо балота з карчамі.

Быў высунуты і трэці варыянт, супнасьць якога ў тым, каб электрастанцыя, пабудаваная на Ясінскім тарфяным масыве, каля Бабруйску, абслугоўвала Бабруйскі, Гомельскі, і Менскі раёны. Але гэты варыянт сам па сабе адпаў па тэй прычыне, што трэба будзе будаваць вельмі доўгія лініі перадачы (звыш 200 кілёмэтраў.

Прадстаўнік ВСНГБ інжынэр Розэнблят зазначыў, што пры вырашэньні пытаньня аб месцы пабудовы раённай электрастанцыі, стымулямі да пабудовы якой зьяўляюцца спажыўцы электраэнэргіі, неабходна мець на ўвазе не тарфяныя масывы, а сучасную і прадугледжаную 5-ці годкай канцэнтрацыю прамысловых прадпрыёмстваў у тым ціінш. пункце. Пабудова электрастанцыі на масыве, а пасьля штучнае разьмяшчэньне вакол яе прамысловых прадпрыёмстваў, якія ў сваю чаргу зьвязаны з мясцовымі сыравіннымі ўмовамі вельмі шкодна адбіваецца на прамысловасьці.

У сувязі з тым, што погляды спэцыялістаў у значнай меры разышліся, нарада пастанавіла вылучыць камісію, якой даручана выбраць месца пабудовы станцыі.

Учора гэтае пытаньне разглядалася ў камісіі, якая большасьцю галасоў прышла да наступнага выводу:

Па прыблізных папярэдніх падліках больш адпавядаючым месцам для пабудовы 2-й раённай электрастанцыі зьяўляецца Гомельскі раён, дзе знаходзіцца больш прамысловых прадпрыёмстваў, якія не патрабуюць тэхналёгічнай пары і для сваіх рухавікоў ня могуць выкарыстаць розных адкідаў у якасьці апалу.

Урачысты выпуск прафкурсаў батракоў.

Учора ў былым маёнтку графа Чапцкага «Волчковічы» адбыўся ўрачысты выпуск 3-хмесячных прафкурсаў батракоў.

На ўрачысты выпуск прыяжджалі з Менску загадчык аддзелу ЦК КП(б)Б тав. Гантман, старшыня ЦВК БССР тав Чарвякоў, загадчыца жанаддзелу ЦК КП(б)Б тав. Крэмер, прадстаўнік ЦСПСБ тав. Гальбрайх і старшыня ЦП саюзу сельскагаспадарчых і лясных рабочых т. Вайтэнка.

Разам з курсантамі прадстаўнікоў партыі і ўраду сустракалі мясцовыя сяляне. Старыя сяляне выказалі жаданьне зьняцца з Усесаюзным і Усебеларускім старостай тав. Чарвяковым, што і было зроблена.

На ўрачыстым пасяджэньні выступілі з прывітаньнямі т. т. Гантман, Чарвякоў, Крэмер, Гальбрайх, ад падшэфнага палка т. Балдзін, прадстаўнікі сельсавету, райкому ЛКСМБ, рабочых савгасу «Прылукі».

Рабочыя савгасу „Прылукі“ паднесьлі т. Чарвякову вянок з калосьсяў жыта і аўса і запэўнілі, што прымуць усе меры да падняцьця ўраджайнасьці.

У адказным слове курсанты—батрачка т Лошакова і батрак т. Шпакоўскі запэўнілі прадстаўнікоў партыі, ураду і прафзаюзаў, што курсанты батракі выканаюць ускладзеныя на іх задачы і пойдуць у вёску будаваць новую сацыялістычную грамаду. Курсанты-батракі прымуць самы актыўны ўдзел у кампаніі перавыбараў саветаў і ў саюзе з беднатой і серадняцтвам утвораць моцныя пралетарскія саветы

Зімовая кампанія дапамогі палітвязьням.

Зімовая кампанія дапамогі палітвязьням па Менскай акрузе разгортваецца слаба. Усяго з 15 лістапада па 5 студзеня па акрузе сабрана каля 4000 руб.

Здавальняюча праходзіць кампанія на Кастрычнікаўскаму раёну, дзе сабрана 2000 р. і Фрунзеўскаму—1056 р.

Слаба праходзіць кампанія на вясковых райкомах МОПР'у. На 11 раёнах акругі сабрана 543 р.

Агітпалёт па Савецкай Беларусі.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам намесьнік старшыні Цэнтральнага Савету ТДА-Авіяхіму БССР паведаміў наступнае аб агітпалёце па Савецкай Беларусі, які хутка мае адбыцца. Па атрыманых вестках ад Саюзнага Савету ТДА-Авіяхіму СССР агітпалёт вылеціць з Масквы для агітпалёту прыкладна 10-15 студзеня і па дарозе наведае частку губерняў РСФСР (Маскоўскую, Калужную і Бранскую).

У БССР такім чынам самалёт можна чакаць у палове лютага.

Агітсамалётам будзе кіраваць пілот тав. Перагонаў.

Па Савецкай Беларусі агітпалёт адбудзецца па наступнаму маршруту: Мазыр-Рэчыца, Гомель, Жлобін, Бабруйск, Слуцак, Менск, Барысаў, Віцебск і т. д.

У мясцох паседкі будуць рабіцца даклады аб задачах ТДА-Авіяхіму, перавыбары мізавых арганізацый і аб 3-ай усесаюзнай лётарэі ТДА-Авіяхіму.

Памятаем загінуўшых гэрояў грамадзянскай вайны.

У мэтах збору матар'ялаў па гісторыі грамадзянскай вайны ў БССР і па захаваньні памяці аб загінуўшых гэроях грамадзянскай вайны, Цэнтральны Савет ТДА-Авіяхіму БССР стварыў спэцыяльную камісію.

У склад камісіі ўваходзяць адказныя працаўнікі ЦС ТДА-Авіяхіму БССР, Музэю Рэвалюцыі, Беларускай Акадэміі Навук і інш. арганізацый.

Камісія ў бліжэйшы час абмяркуе пытаньне аб мерапрыёмствах па стварэньню помніка члену першага (часовага) ураду БССР тав. Мясьнікову.

Падрыхтоўка настаўніцтва.

Зараз на БССР пры педтэхнікумах існуе 7 двохгадовых пэдагагічных курсаў, якімі сёлета будзе выпушчана каля 400 настаўнікаў для вясковых пачатковых школ.

Пэдагагічныя курсы зьяўляюцца часовай установай і ў 1933-34 навучальны годзе ладуць ап шні выпуск у 190 чалавек. У 1934-35 г. педтэхнікумы ўжо цалкам змогуць забясьпечыць настаўнікамі школьную сетку сацвыху.

Вялікі попыт на білеты 3-й усесаюзнай лётарэі ТДА-Авіяхіму.

Рэалізацыя білетаў 3-ай усесаюзнай лётарэі ТДА-Авіяхіму на БССР праходзіць з вялікім посьпехам.

Попыт на білеты з боку мізавых арганізацый ТДА-Авіяхіму поўнасьцю не задавальняецца.

Атрыманая першая партыя білетаў для распаўсюджваньня па БССР у ліку 29000 штук хутка разышлася.

Усяго на БССР павінна быць рэалізавана 70000 білетаў.

Пераклічка саюзаў сельгаслесрабочых БССР і Ленінграду.

Цэнтральнае праўленьне саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых БССР прыняло вызаў Ленінградзкага вобласнага аддзелу саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых на пераклічку аб удзеле саюзу ў перавыбарчай кампаніі сельсветаў.

З гэтай мэтай будзе праводзіцца абмен інфармацыі паміж аддзяленьнямі саюзу аб удзеле саюзу ў перавыбарчай кампаніі, а таксама абмен газэт „Беларускі Батрак“ на «Ленінградскую Праўду».

Культурнае абслугоўваньне беспрацоўных.

З мэтай лепшага абслугоўваньня беспрацоўных, цэнтральнае праўленьне саюзу будаўнікоў пастанавіла трымаць адчыненым свой клюб і ўдзень ад 6 гадзіны раніцы да 4 гадзіны дня.

Клюб друкарэй будзе таксама адчынены дзёнкі для беспрацоўных сяброў саюзу.

Масавая вылазка фізкультурнікаў за горад.

Культаддзел ЦСПСБ разам з Вышэйшым Саветам Фізкультуры БССР арганізуе 13-га студзеня масавую вылазку фізкультурнікаў Менску за горад.

У вылазцы прымуць удзел таксама чырвонаармейскія каманды фізкультурнікаў.

Усяго ў масавай вылазцы прымуць удзел каля 300 чалавек.

СВОДКА № 2

АБ ХОДЗЕ ПЕРАВЫБАРАЎ СЕЛЬСАВЕТАЎ ЗА ПЭРЫЯД З 1-га ПА 9 СТУДЗЕНЯ 1929 ГОДУ.

(Весткі даюцца па 14 раёнах па тэлеграфу).

1. Перавыбрана	22 сельсаветы.	
2. Лік насельніцтва ва ўзросьце звыш 18 г.	25.816 чал.	
3. З іх пазбаўлена выбарчага права	453 „	1,8 проц.
4. Агульны лік выбаршчыкаў	25.363 „	98,2 „
5. З іх жанчын	12.782 „	
6. Зьявілася на выбары	13.799 „	54,4 „
7. З іх жанчын	4.971 „	38,9 „
8. Усяго выбрана членаў сельсаветаў	524 „	
9. З іх жанчын	99 „	18,9 „
10. ПА ПАРТЫЙНАСЬЦІ:		
а) камуністых	38 „	7,3 проц.
б) камсамольцаў	49 „	9,4 „
11. ПА НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦІ:		
а) беларусаў	471 „	89,9 проц.
б) яўрэяў	26 „	5,0 „
в) расейцаў	7 „	1,3 „
г) палякаў	15 „	2,9 „
д) іншых	5 „	0,9 „

СУД.

ХАБАРНІЦТВА І ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ НА МЕНСКАЙ БІРЖЫ ПРАЦЫ.

Пётра Ананіч падаўся службу справаводам фізычнае сэкцыі біржы працы ў Менску.

Абрыдла яму працаваць і ён з часам зволіўся, але пэрэ аманданаў на гэту пасаду Алеся Фёдарава, сына былога афіцэра-дваранина, які меў шырокае знаёмства ў Менску.

Фёдараў і Кастусь Сьнітко распрацавалі план рэгістрацыі гандляроў і прычытнікаў на біржы з мэтай атрымліваць хабар і працы распачаласі.

Сьнітко, спаткаўшы на вечары Алеся Крыніцкага—ўзалара скуранай майстэрні, абяцаў яго, як беспрацоўнага, зарэгістраваць на біржы працы і пасьлаць на работу. Крыніцкі арыгінову Сьнітко прынёс з вялікім здавальненьнем, пачаставаў Сьнітко выпукаў і прыняў на сябе ролю пасрэдніка, пастаўляць Сьнітко кліентаў з непрацоўнага элементу, якія зачасьці ідзі свае майстэрні і хацелі стаць працоўнікамі,—і атрымаць пасады на спэцыяльнасьці.

За хабар ад Гантмана, Лосіна, Мірскага, Тэтэр і іншых Крыніцкі атрымаў па 50-40 р. з кожнага і пазваў іх з Сьнітком, а апошні, маючы знаёмства з справаводам Фёдаравым, зарэгістраваў іх на біржы і накіраваў на працу.

Відома, што Сьнітко з Фёдаравым таксама дзядзіся хабараві, бо Сьнітко ня маючы ніякіх адносін да біржы працы, браў у Фёдарава рэгістрацыйныя карткі і ўдзяручна іх зачаўняў, ня трэбуючы ніякіх дакумантаў ад апманаў аб іх працоўным стажы, а Фёдараў на адсутнасьць гэтых дакумантаў згаджаўся і гандляры рэгістраваліся і накіроўваліся на працу амаль у першую чаргу. Крыніцкі таксама атрымаў работу і запэўніў Сьнітко, што адрэзаюе яму лішнэ ймат прыватнікаў і гэткім чынам магчыма будзе зарабіць.

На судзе Фёдараў сказаў—я хабароў ня браў, але на просьбе Сьнітко рэгістраваў і ймануў і даняраў Сьнітко, што яны маюць дакумэнты аб працоўным стажы.

Сьнітко і Крыніцкі ніяватымі сябе прызналі і ск залі, пам жылося кепска і мы бралі хабары, але-ж яны былі нязначныя ад—15-50 руб. з кліента.

Пётра Ананіч сказаў—я ня ведаў справы Фёдараву, адзін раз зайшоў на біржу да Фёдарава і калі Фёдарану ня было часу, зарэгістраваў аднаго беспрацоўнага,—але ён аднесла бо сябрам саюзу і пінкага хабару ад яго не атрымаў і ня трэбаваў.

Менскі акруговы суд прыгаварыў: Алеся Фёдарава на 2 гады зьняволеньня, Кастуся Сьнітко і Алеся Крыніцкага на адзін год і 6 месяцаў зьняволеньня без пазбаўленьня ў правох. Ананіч на суд зарэўданы. Па амнэстыі мера сацыяльнай абароны асуджаным скарочана наполову.

АДКАЗНЫ СЭКРАТАР—РАСТРАТЧЫК.

Рыгор Уладзімераў Лукашэвіч 24 лістапада 1924 году, як адказны сэкратар Вышэйшага Савету Фізычнае Культуры Беларусі, атрымаў аванс 3000 р. на закупку ў Маскве лыж, пратрымаў гэты аванс месяц у кішэні і заместа таго, каб перанесьці ў Маскву праз касу Наркамфіну, пазжэйшы грошы ў партфэль і накіраваўся ў Маскву. На станцыях і ў буйных гарадох па шляху да Масквы Лукашэвіч выходзіў з цягнка, наведваў буфеты, а, урэшце, у Маскве згубіў партфэль з авансам.

У 1925 і 1926 гадох Лукашэвіч, ня гледзячы на зроблене ім злачынства, служыў адказным сэкратаром і ў мод службовага становішча зноў атрымаў 75 р. пазычкі з беспрацвалцю, аванс на пабудову плянёрскі пры саўце „Прафінтэрн“ 265 р. і на правядзеньне курсаў на фізкультуры 1682 р. 50 к., але грошы гэтыя на вялікасьці не расходаваў, а растраціў.

2 лютага 1927 г. Лукашэвіч з касы адказнага сэкратара быў зьняты. Расачаўся на справу сьледства, але Лукашэвіч не сумаваў і пазрабіўшы подпіс намесьніка старшыні савету фізкультуры Цэйтліна—і сфабрыкаваўшы гарантыю, Лукашэвіч атрымаў у Менакрэдсэце палянічную стрэльбу, разьвітаўся з Менскам, парушыў дадзеную падпіску аб нявыезьдзе да суду з Менску і накіраваўся ў г. Баку дзе адразу прыстасіваўся інструктарам Бакінскага райсаюзу ТДА-Авіяхіму.

Як інструктар, Лукашэвіч і на новай працы меў сарасу з грашыма і праз некаторы час прагуляў ня ня 1637 руб. і зноў хацеў выйсьці свае жыхарства, але яго затрымалі і аддалі суду.

Пасуд г. Баку засудзіў Лукашэвіча на тры гады зьняволеньня і накіраваў Лукашэвіча ў Менск расклітацца за аванс перад Менскім акруговым судом.

Справа Лукашэвіча разглядзена і Менскі акруговы суд прысаварыў Рыгора Лукашэвіча на пяць гадоў зьняволеньня з суровым адмяжаваньнем без дастаканьня амністыі, акрамі таго суд прысудзіў з Лукашэвіча на карысьць Бакінскага райсаюзу Менскага 80 р. і на карысьць дзяржавы 2048 р. 16 к.

К.

Апавяшчэньне.

У пятніцу, 11-га студзеня г. г. роўна а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні 2 школы адбудзецца пасяджэньне сэкцыі Нарасьветы Менскага гарсавету сумесна з загадчыкамі школ і настаўніцтвам.

На парадку дню наступныя пытаньні:

1 аб удзеле ўстаноў нарасьветы ў перавыбарах саветаў;

2) інфармацыя аб разьмеркаваньні фонду на дапамогу беднейшым вучням;

3) аб абсьледваньні ўстаноў народнае асьветы.

ЯЎКА З ЗАГАДЧЫКАЎ ШКОЛ АБАВЯЗКОВА.

ЗАПРАШАЮЦЦА НАСТАЎНІКІ.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ.

Прэзыдыум Ц. П. саюзу Беларпрасьветы, азнаёміўшыся з матар'ялямі, якія дасланы ў ЦП партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі Горанкай С.-Гасп. Акадэміі і Арэнскім акр праўленьнем саюзу аб праф. Люнгергаузэне, лічыць неабходным адзначыць, што фэльетон „Пэрэвова прафэсары“, зьмешчаны ў „Савецкай Беларусі“ № 288, і тыя выпікі, якія зроблены на аснове гэтага фэльетону ў артыкуле «Асьветніцкі ня навабарчай кампаніі саветаў»—№ 297, у адносінах да праф Люнгергаузена ня адпавядаюць сапраўднасьці

Праф. Люнгергаузэн зробіў даклад як дэпутат гарсавету, і зьяўляецца актыўным грамадзкім працаўніком.

Прэзыдыум ЦП саюзу Беларпрасьветы.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

ПЯТНІЦА, 11-га СТУДЗЕНЯ

Саюзу Дрэваапрацоўшчыкаў

„ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ“

Пачатак а 8-й гадз. увечары.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. Амэрыканскі баявік „ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА“ Звыш праграмы—ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 46.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 8-га студзеня „БЯЗЬБІЛЕТНЫ ПАСАЖЫР“. з удзелам ОСІ ОСВАЛЬД.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. Вячэрнія сэансы для дарослых „УДАЛЫ СКОК“ камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка «Совкіно» № 60.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). Дзіцячы фільм вытворчасьці «Белдзяржкіно». „ЖЫВЫЯ ДАМЫ“ у 5 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка „Совкіно“ № 61. Штодзень 2 сэансы: 3 з пал і 5 гадз. Цана білета 15 к.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 8 студзеня „ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ“ камэдыя ў 6 частках з удзелам ІГАРА ІЛЬІНСКАГА. звыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА № 47.

Дзяржаўная Цэнтральная Рэмонтна-Вымяральная Майстэрня пры Беларускай Палаце Мер і Вагі

—) ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА (—

грамадзян, якія здалі тыя ці іншыя свае вымяральныя прылады ў рэмонт і кляйменьне ў 1926, 1927 і наогул да кастрычніка 1928 г. і ня выкупілі іх да 15 студзеня г. г.,

што майстэрня астаўляе за сабою права

ПРОДАЖУ ГЭТЫХ ПРЫЛАДАЎ

Загадчык майстэрні СМАРЫГІН.

Гр-н ЦЯЛУШКА Уладзімер Хведаравіч,

які находзіць в гр-н Полацкай акругі, Ветрынскага р-пу, Шпакоўскага с-с., вёс. Загузьво, і жыве ў сучасны момант у м. Ушачы, Полацкай акругі, жадае зьмяніць прозьвішча на

З І М І Н.

Асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвіша, просьба паведаміць аб гэтым Полацкі ЗАГС, пакінуўшы сваё імя, імя па бацьку і прозьвішча і месца жыхарства.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Справка аб працы Бардзіна А. М., выд. Шчадэрнай фэбрыкі, кв. 353.

— Біржавы талён Фінкельштэйна Г. Ш., выд. Менбіржай працы, кв. 354.

— Дапрызыўная кніжка за № 482 Зарамбоўскага П. Я., выд. Капыльскім РВК, кв. 355.

— Пасьведчаньне за № 74 Дрэйзіна М. Б., выд. ЦІТам, кв. 356.

— Лекавая кніжка № 9096 Кірынскага І. С. выд. Мазырск. акрстрахкасай кв. 357.

— Сяброўская кніжка № 63 Глухава І. Ф., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 358.

— Сяброўская кніжка Пухавіча Л., выд. Мазырскім ЦРК. кв. 359.

— Біржавы талён Калоніка А. Ф., выд. Менбіржай працы, кв. 360.

— Біржавы талён за № 2410 Кавалюка С. А., выд. Менбіржай працы, кв. 361.

— Сяброўскі білет за № 20129 Бардзюкава Я. С., выд. Барысаўск. с. саюзам с.-гасп. і лясных рабочых, кв. 362.

— Біржавы талён за № 1208 № Цэрла І. О., выд. Менбіржай працы, кв. 363.

— Сяброўская паявая кніжка Дадалко І., выд. Чэрвенск. спаж. т-вам, кв. 364.

— Сяброўская паявая кніжка Тарасіка В., выд. Чэрвенск. спаж. т-вам, кв. 365.

Вышаў з друку, рассылаецца падпісчыкам і паступіў у продаж

№ 10 „ПОЛЫМЯ“ № 10

штомесячны беларускі часопіс літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

(ВОСЬМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ).

Пад рэдакцыяй: А. Баліцкага, Я. Васілевіча, З. Жылуновіча (адказны рэдактар), Я. Купалы, М. Чарота.

ЗЬМЕСТ:

Я. Нёманскі. Дранежнікі—раман (працяг); Удзяку Аніта. Скок шкілетаў—п'еса (пераклаў з японскай мовы З. Сьнежка); В. Сташаўскі. Чорная ноч—апавяданьне; Ажард Лайцэн. Жах штандару—апавяданьне (пер. з латыскай мовы К. Езавітаў); Андрэй Александровіч. Беларусь Савецкая—верш; Мікайла Грамыка. Юбілейнае—верш; Якуб Колас. На шляхох волі—паэма; Вялеры Марэкоў. Беларусі—верш; Вялеры Маракоў. Цішу Гартнаму—верш; Юрка Лявоны. Ротры каляровыя—верш; Уладзімер Хадыка. Кулачбты і штыкі—верш; З. Жылуновіч. Беларускія сэкцыі РКП і стварэньне Беларускай Савецкай Рэспублікі; М. Карклін. Шлях змаганьня, аднаўленьня і новага сацыялістычнага будаўніцтва; А Чарвякоў. Пясьняр змаганьня і змагар за Савецкую Беларусь; С. Замбрыцкі. Першы беларускі пралетарскі паэта і пісьменьнік (творчасьць Цішкі Гартнага); А Клейнборт. З мінуўшчыны беларускай грамадзкасьці (на дваццацігодзьдзі літаратурнай дзейнасьці Цішкі Гартнага); М. Малевіч. З. Жылуновіч. як гісторык; Аркадзь Гадзь. Тры этапы (эра мастацкую прозу Цішкі Гартнага); Я. Лёсік. Граматычны склад мовы Цішкі Гартнага; Кніганіс—А. Бачыжэўскі. А. Цьвяткоў, М. Касьпровіч, Б. і Ф; Да 20-шігадовага юбілею беларускага пралетарскага паэты Цішкі Гартнага; Хроніка беларускае культуры; Хроніка культурнага жыцьця замежных краін; Хроніка украінскага культурнага жыцьця.

Прымаецца падпіска на „ПОЛЫМЯ“ на 1929 год.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: На год . . . . . 12 руб. —